На выставе ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі пахне шакаладам і ваніллю. Хоць тэма выставы вельмі сур'ёзная — «1812-ы: погляд праз два стагоддзі»... СТАР 3

Не сакрэт, што ў апошнія гады сярэдні бал удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы і фізіцы зусім не радаваў ні школьных педагогаў, ні экзаменатараў... СТАР 3

Хто што экзатычнага сёлета вырасціў? Або пасадзіў звыклую культуру, але атрымаў надзвычай багаты ўраджай? Пачалі з міні-апытання саміх работнікаў «Звязды». Можа, і чытачы далучацца? СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЖНІЎНЯ 2012 г. СЕРАДА № 166 (27281) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРЭЗІДЭНТЫ БЕЛАРУСІ І АЗЕРБАЙДЖАНА ПАЦВЯРДЖАЮЦЬ ПРЫХІЛЬНАСЦЬ ДА ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ АДНОСІН ВА ЎСІХ СФЕРАХ

«Вы прыехалі ў вельмі блізкую і дружалюбную краіну, дзе вас любяць і паважаюць за тыя вялікія справы, якія вы зрабілі для нашай дзяржавы, часам нестандартныя, па падтрыманні нашай краіны ў цяжкую хвіліну, гэта было звязана з пытаннем незалежнасці. І беларусы аб гэтым ведаюць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да лідара Азербайджана Ільхама Аліева, які знаходзіцца ў Мінску з візітам.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі з Азербайджанам няма закрытых тэм ні для перагавораў, ні ў цэлым ва ўзаемаадносінах. «Па любым пытанні, якое вы толькі можаце паставіць і гэта патрэбна для Азербайджана, мы заўсёды адгукнёмся», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на стратэгічны характар супрацоўніцтва дзвюх краін. Тавараабарот Беларусі і Азербайджана за мінулы год наблізіўся да $1 млрд. У гэтым годзе ёсць некаторае адставанне, аднак Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў рашучасць беларускага боку навярстаць упушчанае.

Дзве краіны звязваюць вельмі даўнія адносіны дружбы. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, яшчэ з часоў Гейдара Аліева закладваліся асновы ўзаемаадносін, але тое, што было зроблена за апошнія гады з Ільхамам Аліевым, — гэта вялікі прарыў. «Мы і ў далейшым будзем дзейнічаць у інтарэсах двух народаў, і вы ніколі прэтэнзій да нас прад'яўляць не будзеце», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сустрэчы з яго азербайджанскім калегам ужо сталі традыцыяй, і яны даюць магчымасць кантраляваць выкананне дамоўленасцяў. Ён адзначыў, што Беларусь разлічвае на падтрымку сумесных вытворчасцяў, з улікам іх падключэння да механізмаў дзяржаўных і галіновых праграм.

Кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў увагу на тое, што створаныя ў Азербайджане сумесныя вытворчасці добра сябе зарэкамендавалі. Сёння там выпускаюцца трактары, грузавыя і камунальныя аўтамабілі, аптычныя прыборы, святлодыёдныя свяцільні. Сярод новых напрамкаў дамінуе вытворчасць колавых цягачоў і аўтобусаў МАЗ. У 2011 годзе зборачныя вытворчасці забяспечылі амаль 40 працэнтаў беларускага экспарту.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што гэтыя перамовы стануць чарговым значным этапам у двухбаковых адносінах, дадуць магчымасць намеціць новыя напрамкі супрацоўніцтва. «Лічу, што калі мы такімі тэмпамі будзем рухацца ў адносінах, то суседзі маюць права нам пазайздросціць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. СТАР 2

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎЗНАГАРОДЗІЎ ІЛЬХАМА АЛІЕВА ОРДЭНАМ ДРУЖБЫ НАРОДАЎ

ПРЭЗІДЭНТ Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева ордэнам Дружбы народаў. Рашэнне аб прысуджэнні такой высокай узнагароды кіраўнік беларускай дзяржавы прыняў учора пасля перагаворaў са сваім азербайджанскім калегам, перадае БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэты ордэн уручаецца невялікай колькасці палітыкаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай дзяржавы і пашырэнне ўзаемасувязяў. «Гэта гістарычная ўзнагарода — даніна павагі вам, Ільхам Гейдаравіч, і ўсяму азербайджанскаму народу», — сказаў беларускі лідар.

«Калі нам было вельмі цяжка, і аб гэтым ведае ўвесь беларускі народ, мы звярнуліся да шэрагу дзяржаў, і першы на нашу просьбу адгукнуўся Азербайджан у асобе Прэзідэнта. Мы гэта добра помнім і ніколі не забудзем», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

У сваю чаргу Ільхам Аліеў падзякаваў за прысуджэнне яму такой высокай узнагароды. «Я буду рабіць усё, каб яшчэ больш збліжаць нашы краіны і народы», — сказаў ён.

Фота БЕЛТА.

БУДЗЕ І НА ШАРЛОТКУ, БУДЗЕ І НА КАМПОТ!

ФЕРМЕРСКАЯ гаспадарка «Берасцейскае» была закладзена каля вёскі Булькава Брэсцкага раёна шэсць гадоў таму на плошчы ў 150 гектараў Ігарам Леванюком. За гэтыя гады шмат паспеў зрабіць фермер. Асвоены тэхналогіі вытворчасці многіх відаў гародніны. Закладзены сад, у якім растуць яблыні, грушы, слівы, чорныя парэчкі лепшых еўрапейскіх селекцый. Узведзена гароднінасховішча на 3,5 тысячы тон прадукцыі адначасовага захоўвання.

НА ЗДЫМКУ:
Садаводы Алена АКТЫСЮК і Аліна ТУНЧЫК вядуць збор сліў.
Фермер Ігар ЛЕВАНЮК у яблыневым садзе.

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег ШЭПЕЛЬ, старшыня Паралімпійскага камітэта Беларусі:

«Перад беларускімі паралімпійцамі пастаўлена задача-мінімум – увайсці ў васьмёрку наймацнейшых у сваіх відах спаборніцкай праграмы, такім чынам, турыстаў у спартыўнай камандзе няма. Практычна ўсе пажаданні паралімпійцаў, звязаныя з падрыхтоўкай, экіпіроўкай, фармакалогіяй, удзелам у міжнародных турнірах, выкананы на 100 працэнтаў».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 20°
Віцебск	+ 18°
Гомель	+ 17°
Гродна	+ 19°
Магілёў	+ 18°
Мінск	+ 17°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 29.08.2012 г.

Долар ЗША	8380,00	▲
Еўра	10460,00	▲
Рас. руб.	261,50	▼
Укр. грыўня	1034,38	▲

■ Кампетэнтна

Віктар КАМЯНКОЎ, Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, старшыня ГА «Беларускі саюз юрыстаў»:

«БАНКРУЦТВА БЫВАЕ ЎДАЛЫМ»

Словы «банкруцтва», «эканамічная неплацежаздольнасць» часта маюць негатыўную канатацыю, асацыюючыся ў свядомасці таго, хто чуе іх, з дрэнным эканамічным станам арганізацыі, прадпрымальніка, а часам і цэлай дзяржавы. Аднак ва ўмовах рынкавай эканомікі існаванне інстытута банкруцтва сведчыць аб памкненні да цывілізаваных адносін і першапачатковай гарантыі абароны правоў і збалансаванасці інтарэсаў крэдытораў, даўжнікоў і грамадства.

Лёс паспяховай санацыі аднаго з беларускіх прадпрыемстваў Гомельшчыны заслугоўвае ўвагі адначасова як прыклад эфектыўнасці мер па фінансавым аздараўленні (санацыі) і як абвяржэнне тэзісу аб банкруцтве як аб непазбежным краху.

Фота БЕЛТА.

САНАЦЫЯ: 15 працэнтаў удаецца рэанімаваць

Энцыклапедычны слоўнік змяшчае наступнае азначэнне вышэйзгаданага паняцця: «неплацежаздольнасць (банкруцтва)... (англ. insolvency or bankruptcy) — умова, пры якой пасівы індывіда або фірмы перавышаюць актывы. Таму гэты індывід або фірма няздольныя выканаць усе назапашаныя фінансавыя абавязацельствы пасродкам рэалізацыі сваіх актываў».

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)» (са змян. і дап., якія ўвайшлі ў сілу з 15.02.2010) (далей — Закон аб банкруцтве) у арт. 1 вызначае, што эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва) — неплацежаздольнасць, якая мае або якая набывае ўстойлівы характар, прызнаная гаспадарчым судом у адпаведнасці з названым Законам.

Гэты ж Закон (арт. 12) устанавіў, што пры разглядзе справы аб банкруцтве даўжніка — юрыдычнай асобы — прымяняюцца наступныя працэдуры банкруцтва:

- абаронны перыяд;
- конкурсная вытворчасць;
- міравое пагадненне;
- іншыя працэдуры банкруцтва.

Пры гэтым конкурсная вытворчасць уключае наступныя працэдуры: санацыю і ліквідацыйную вытворчасць.

Санацыя — працэдура конкурснай вытворчасці, якая прадугледжвае пераход права ўласнасці, змяненне дагаворных і іншых абавязацельстваў, рэарганізацыю, рэструктурызацыю або аказанне фінансавай падтрымкі даўжніку, і ажыццяўляецца для аднаўлення яго ўстойлівай плацежаздольнасці і ўрэгулявання ўзаемаадносін даўжніка і крэдытораў у вызначаныя тэрміны. СТАР 2

■ Прамая лінія

ПРА ПЕНСІІ, І НЕ ТОЛЬКІ

Няма сумненняў, што пытанні, звязаныя з выплатай пенсій, адраснай сацыяльнай дапамогі з'яўляюцца актуальнымі для многіх мінчан. Таму ў чарговай прамой тэлефоннай лініі ў сценах рэдакцыі газеты «Звязда» прыме ўдзел **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна Аляксандраўна РАМАНОВІЧ.**

Такім чынам, увага! Задаць пытанні і выказаць свае пажаданні Жанне Аляксандраўне можна будзе **сёння, 29 жніўня, з 10.00 да 12.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.**

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары **8 (017) 287 18 29.**

■ Прамая лінія з міністрам працы і сацыяльнай абароны

Сёння, 29 жніўня, з 11.00 да 12.00, міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі МАРЫЯНА АКІНДЗІНАЎНА ШЧОТКІНА правядзе прамую тэлефонную лінію і анлайн-прыём.

У гэты дзень **па тэлефоне (017) 306-37-95** любы грамадзянін краіны зможа задаць пытанне міністру, падзяліцца сваім меркаваннем, выказаць прапановы па актуальных пытаннях у сферы заканадаўства аб працы і сацыяльнай абароне.

Акрамя таго, з мэтай пашырэння магчымасцяў задаць пытанне міністру для грамадзян краіны, якія не змогуць датэлефанавацца, на гэты час, на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны будзе арганізаваны анлайн-прыём.

Адказы на пытанні, зададзеныя падчас анлайн-прыёму, будуць апублікаваны ў рэжыме рэальнага часу ў адкрытым доступе.

Правілы звароту на прамую тэлефонную лінію альбо шляхам электроннага звароту

У адпаведнасці з заканадаўствам аб зваротах грамадзян, просім пры звароце на прамую тэлефонную лінію або пры адпраўцы электроннага звароту ўказваць: імя па бацьку і звесткі аб месцы жыхарства і (або) працы (вучобы). Звяртаем вашу ўвагу, што пры размяшчэнні адказу на ваша пытанне на сайце міністэрства ў адкрытым доступе звесткі аб месцы жыхарства, работы, вучобы размяшчацца не будуць (на сайце будуць паказаны толькі імя прозвішча і населены пункт).

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГРЭЧАСКІ ПРЭМ'ЕР ПАЗБАЎЛЯЕЦЦА АД ДВУХ З ТРОХ УРАДАВЫХ САМАЛЁТАЎ З-ЗА КРЫЗІСУ

Прэм'ер-міністр Грэцыі Антоніс Самарас вырашыў пазбавіцца ад двух з трох урадавых самалётаў прадстаўніцкага класа, каб зменшыць выдаткі дзяржбюджэту. Аб гэтым рашэнні абвясціла яго прэс-служба.

«Згодна з рашэннем, прынятым Антонісам Самарасам, 13-мясцовы рэактыўны самалёт вытворчасці бразільскай кампаніі Embraer будзе прададзены і сродкі ад гэтага будуць перададзены ўзброеным сілам Грэцыі, — гаворыцца ў паведамленні. — Другі, 30-мясцовы, Embraer будзе перададзены грэчаскім ВПС і будзе выкарыстоўвацца як для навучання пілотаў самалётаў радыёлакацыйнай разведкі, так і для транспарціроўкі параненых, органаў для трансплантацыі, а таксама каб пазбегнуць празмернага выкарыстання ваенна-транспартных самалётаў».

Самалёт Gulfstream застанецца ў распараджэнні ўрада, аднак і ён, пры адпаведным запыце, будзе прадастаўляцца ВПС краіны для скарачэння выдаткаў на выкарыстанне ваенна-транспартнай авіяцыі.

ТАЙФУН «БАЛАВЕН» ЗАТАПІЎ ДВА КІТАЙСКІЯ РЫБАЛОЎНЫЯ СУДНЫ

Без вестак прапалі 28 чалавек, перадаюць інфармагенцтвы.

Тайфун «Балавен», які лічаць самым моцным за апошнія 60 гадоў, ударыў па Паўднёвай Карэі раніцай 28 жніўня. Стыхія затапіла два кітайскія рыбалоўныя судны, на якіх знаходзіліся 34 чалавекі. Шэсць чалавек былі знойдзены і выратаваны, астатнія лічацца прапаўшымі без вестак. З-за абрываў ліній электраперадач абясточанымі засталіся, паводле розных даных, ад 50 тыс. да 200 тыс. дамоў.

Метэаралагічная служба Ганконга сцвярджае, што хуткасць парываў «Балавена» можа дасягаць 185 км/гадз. А яго даўжыня ў дыяметры — больш за 2 тыс.км. Гэтыя два паказчыкі ставяць яго ў катэгорыю «супертайфун». Цяпер тайфун імкліва набліжаецца да берагоў Расіі.

У сувязі з нялётным надвор'ем усе авіярэйсы на востраве Чэджуда і ў сталічным міжнародным аэрапорце Інчхон часова адменены.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АМЕРЫКАНЦЫ СКЛАЛІ СПІС ПРАДУКТАЎ, ЯКІЯ ВЫКЛІКАЮЦЬ СТОМЛЕНАСЦЬ

Як паведамляе MedikForum, амерыканскія вучоныя ў выніку сур'ёзнага даследавання прыйшлі да высновы наконт таго, што некаторыя папулярныя прадукты неспрыяльна адбіваюцца на працаздольнасці чалавека і правакуюць дрымотнасць.

У топавы спіс прадуктаў, з-за якіх чалавек адчувае сябе стомленым і разбітым, трапілі прадукты, якія мы часта набываем у супермаркетах. На першым месцы аказалася спіртное, якое выклікае дрымотнасць. Затым ідуць прысмакі, якія змяняюць узровень глюкозы ў крыві і выклікаюць стомленасць.

На трэцім месцы мяса індычкі. Навукоўцы ўстанавілі, што бялкі, якія змяшчаюцца ў ім, зніжаюць працаздольнасць. Да хуткай стамляльнасці прыводзяць і мучныя вырабы, у тым ліку макаронныя, з белай пшанічнай мукі. Іх ужыванне прыводзіць да скачкоў хуткасвоеваяльнай глюкозы ў крыві. Гэта спачатку выклікае прыліў энергіі, але затым наступае такі ж хуткі энергетычны адток. Таксама ў топ-ліст трапіла смажаная ежа. Арганізм траціць на яе пераварванне занадта шмат часу, і яна ўздзейнічае раздражняльна на страваваль-ны тракт.

КАРОТКА

Да канца года Беларусь і Расія дасягнуць канкрэтных дамоўленасцяў па стварэнні холдынгу на базе беларускага «Гомсельмаша» і расійскага «Ростсельмаша». Пра гэта паведаміў першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка.

Паводле інфармацыі аналітычнага агляду «Маніторынг умоў банкаўскага крэдытавання» Нацыянальнага банка, попыт на крэдыты ў беларускіх рублях у другім квартале 2012 года павысіўся з боку ўсіх катэгорый крэдытаатрымальнікаў. У трэцім квартале 2012 года банкі не чакаюць зменаў у попыце крэдытаатрымальнікаў на крэдыты. Выходзячы з ацэнак банкаў, найбольшы попыт на крэдыты чакаецца ў чацвёртым квартале 2012 года.

Пасля аварыі на АЭС у прэфектуры Фукусіма многія японцы сталі карыстацца беларускімі дазіметрамі, паведаміў японскі эксперт Сансіра Хосака, які курыраваў раней беларуска-японскі праект у галіне радыяцыйнай бяспекі. Ён адзначыў, што гэта абсталяванне высокаінтэграванае з ІТ-тэхналогіямі.

Рух па трасе Мінск-Гродна 29 жніўня будзе часткова абмежаваны, паведамілі карэспандэнту ва УДАІ Мінскай вобласці. У прыватнасці, з 10.00 да 12.00 будзе абмежаваны рух усіх відаў транспарту ў абодвух напрамках на 31-м кіламетры трасы. На гэтым месцы раней адбылося сур'ёзнае ДТЗ, і будзе праведзены следчы эксперымент.

Ізраільскія вучоныя даказалі, што ў сне чалавек здольны вучыцца. Гэта значыць, наш мозг можа засвойваць новую інфармацыю, паведамляюць інфармагенцтвы. Раней высветлілася, што падчас сну мозг парадкуе ўспаміны і замацоўвае атрыманыя веды.

ЯКІ ГАЛОЎНЫ УРОК ВЫ АТРЫМАЛІ АД СВАІХ БАЦЬКОЎ?

Таццяна КРЭНЬ, выкладчык-арганізатар Арэхаўскай сярэдняй школы Маларыцкага раёна:

— Мае бацькі навучылі мяне многаму — шчырасці, дабрыні, адкрытасці ў адносінах да іншых людзей. Вельмі запамінальнымі для мяне былі моманты, калі мама з татам на ўласным прыкладзе паказвалі, як важна ўмець часам змаўчаць, падумаць, перш чым гаварыць, правільна адчуваць дыстанцыю пры кантактаванні з іншымі людзьмі. І самае галоўнае — калі чалавек знаходзіцца ў цяжкім становішчы, заўсёды падтрымаць яго, перш за ўсё маральна.

Дзяніс ШКЛЯННІК, студэнт 4 курса факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ:

— Галоўны ўрок, які я атрымаў ад бацькоў, — гэта любоў да чытання. Недарэмна ж кажуць, што кніга — лепшы падарунак, лепшы настаўнік і часам нават лепшы сябра. Калі я быў маленькім, то досыць скептычна ставіўся да твораў, якія чыталі ў школе. Але як толькі прачытаў сваю першую кнігу, якую параіла мама, мяне азарыла. Я зразумеў, што кнігі адкрываюць для мяне іншы свет, дазваляюць перажываць новыя эмоцыі і здабываць карысныя веды. Там ёсць тое, чаго часам не хапае: павучальныя гісторыі, напоўненыя трагедыяй і перажываннямі, мудрасцю, і безумоўна, гісторыі пра сапраўднае каханне.

Алена БЕРАЗОЎСКАЯ, старшы выкладчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Інстытута журналістыкі БДУ:

— Самае каштоўнае, на мой погляд, чаму навучылі мяне мае бацькі, — гэта быць самастойнай. Не спадзявацца, што нехта штосьці за мяне зробіць, што мне пашанцуе, а, па магчымасці, выкладвацца на ўсе сто: вучыцца, працаваць. Не памятаю, каб мае бацькі правяралі, ці зрабіла я ўрокі — калі толькі ў першым класе. Мне самой гэта было цікава. Яны бачылі інтарэс, таму і не дакучалі залішнімі турботамі. Я магла сама планаваць свой дзень. Дарэчы, яшчэ адзін каштоўны ўрок ад мамы — павага да настаўніка. Калі мы з сястрой дазвалялі сабе ў нечым абвінавачіць настаўніцу — што яна нам не тую адзнаку паставіла ці да дошкі выклікала раптоўна — мама практычна заўсёды падтрымлівала настаўніцкі бок. Што да агульначалавечых каштоўнасцяў, дык мне здаецца, немагчыма навучыць маленькага чалавека быць добрым, калі ты сам злы. Бацькі пастаянна вучаць мяне быць гаспадарлівай, эканомнай, паважаць працу іншых людзей.

Алена ДРАПКО.

ПРЭЗІДЭНТЫ БЕЛАРУСІ І АЗЕРБАЙДЖАНА ПАЦВЯРДЖАЮЦЬ ПРЫХІЛЬНАСЦЬ ДА ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ АДНОСІН ВА ЎСІХ СФЕРАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сваю чаргу Ільхам Аліеў сказаў, што гэта традыцыя дае магчымасць бачыць цудоўны вынік: працуюць сумесныя вытворчасці, расце аб'ём узаемнага гандлю, ёсць поспехі ў розных сферах. «Адносіны Беларусі і Азербайджана вызначае высокі ўзровень дынамізму і канкрэтыкі». Ільхам Аліеў адзначыў, што Прэзідэнт Беларусі прыняў запрашэнне ў 2013 годзе наведаць з візітам Азербайджан. «Гэта будзе яшчэ адна магчымасць прааналізаваць тое, што ўжо выканана, і намеціць далейшыя шляхі развіцця нашых адносін», — сказаў Прэзідэнт Азербайджана.

«Нашы адносіны вызначае вельмі высокі ўзровень дынамізму, канкрэтыкі, прадказальнасці. Самае галоўнае, што механізм выканання прынятых рашэнняў даведзены да вышэйшай якасці. Усё, аб чым мы дамаўляемся, мы бачым у выніках: новыя вытворчасці, пашырэнне існуючых вытворчасцяў, новыя перспектывы, новыя ідэі», — падкрэсліў Ільхам Аліеў.

Прэзідэнт Азербайджана выказаў упэўненасць у неабходнасці больш шырокага ўдзелу азербайджанскага бізнэсу ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у Беларусі. «Гэты напрамак супрацоўніцтва знаходзіцца на пачатковай стадыі. Першыя вынікі паказваюць правільнасць гэтага падыходу. Лічу, што не толькі прыватныя кампаніі, але і дзяржаўныя павінны больш актыўна ўдзельнічаць у інвестыцыйных праектах у Беларусі, якія мы вызначым і якія будуць служыць нашым агульным інтарэсам», — сказаў ён. Ільхам Аліеў дадаў, што азербайджанскія кампаніі цяпер актыўна ўкладваюць інвестыцыі за мяжой.

Паводле яго слоў, апошнім часам значна пашырыліся сферы ўзаемнага супрацоўніцтва. Аб гэтым сведчыць і тое, што ў склад дэлегацыі Азербайджана ў час цяперашняга візіту ўвайшла значная частка членаў урада.

Ільхам Аліеў падзякаваў кіраўніцтву Беларусі за падтрымку Азербайджана на міжнароднай арэне, у прыватнасці за вылучэнне Азербайджана ў склад Савета Бяспекі ААН. «Палітычныя адносіны дзвюх краін характарызуюцца высокай ступенню дынамізму. За кароткі час мы шмат чаго дасягнулі», — адзначыў Прэзідэнт Азербайджана.

Ён таксама звярнуў увагу на ўзросшы ўзровень тавараабароту Беларусі і Азербайджана за апошні час. У асноўным гэта адбылося за кошт пашырэння супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы. Але ў будучым, на яго думку, рост тавараабароту павінен ісці не толькі за кошт энергетыкі, але і за кошт павелічэння аб'ёму продажаў тавараў і паслуг. Ільхам Аліеў пераканаў, што ў тых вытворчасцяў, якія створаны ў Азербайджане сумесна з Беларуссю, ёсць добрыя перспектывы развіцця і выхаду іх прадукцыі ў трэція краіны.

«Я лічу, што адметным момантам нашых адносін з'яўляецца менавіта тое, што за ініцыятывамі і за фразеалогіяй стаяць канкрэтныя справы. Яшчэ не было ніводнага пытання, якое мы не змаглі б вырашыць», — падкрэсліў Ільхам Аліеў. Ён таксама адзначыў пашырэнне супрацоўніцтва Беларусі і Азербайджана ў гуманітарнай і ваенна-тэхнічнай сферах.

Кіраўнікі дзвюх дзяржаў у час сённяшніх перагавораў маюць намер прааналізаваць ужо зробленае краінамі, вызначыць новыя праекты і ініцыятывы.

БЕЛТА.

У ЭКАНОМІЦЫ НАШАЙ КРАІНЫ Ў СТУДЗЕНІ-ЛІПЕНІ БЫЛО ЗАНЯТА 4 МЛН 571,2 ТЫС. ЧАЛАВЕК

Гэта на 2,2% менш, чым у студзені-ліпені мінулага года, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Арганізацыямі рэспублікі (без суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) у студзені-ліпені гэтага года было прынята на працу 478,4 тыс. чалавек, у тым ліку на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы — 28,4 тыс. чалавек.

Паводле аператыўных статыстычных звестак, у студзені-ліпені было звольнена па розных прычынах 512,4 тыс. чалавек. З іх 6,9% — за прагул і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны, 0,9% — у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў, ліквідацыяй арганізацый.

У Белстаце праінфармавалі, што колькасць беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, на канец ліпень 2012 года склала 27,3 тыс. чалавек. Гэта на 10,5% менш, чым на канец ліпеня мінулага года, і на 2,1% менш, чым на канец чэрвеня гэтага года. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на канец ліпеня 2012 года (таксама як і на канец ліпеня 2011-га) склаў 0,6% ад эканамічна актыўнага насельніцтва краіны.

■ Ва ўрадзе

ГРАФІК ПАВІНЕН ВЫКОНВАЦЦА

Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў своечасова забяспечыць пастаўку даільнага абсталявання

Аб гэтым прэм'ер-міністр Беларусі заявіў на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна 28 жніўня, дзе разглядаўся ход выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы, дадзеных пры наведванні МТФ Мінскай вобласці, па рэканструкцыі малочнатаварных ферм з установкай даільных залаў.

Пералікі даільнага абсталявання вызначаны, зацверджаны графік паставак, і ён павінен, якое настаўляецца, выконвацца, падкрэсліў прэм'ер-міністр. Ён даручыў Мінсельгасхарчу завяршыць тэндары на пастаўку абсталявання на малочнатаварныя комплексы і ўдакладніць графікі паставак. «Усё абсталяванне для даільных залаў павінна быць пастаўлена на малочнатаварныя фермы не пазней за 1 снежня гэтага года», — нагадаў ён.

Кіраўнік урада звярнуў асаблівую ўвагу на важнасць падрыхтоўкі ферм да ўстаноўкі сучаснага абсталявання. «Даільная зала — гэта не навес для захоўвання сена, а складанае інжынернае робатызаванае збудаванне з электронікай, механікай і г.д.», — сказаў ён.

Міхаіл Мясніковіч даручыў Мінфіну сумесна з Мінсельгасхарчам, Нацбанкам і Банкам развіцця вырашыць пытанні па выдзяленні крэдытных рэсурсаў для закупкі даільных установак для малочнатаварных ферм на ўмовах лізінгу. Для гэтага спатрэбіцца мінімум Br800 млрд. У банкаўскай сістэме такія рэсурсы ёсць, і іх трэба выкарыстоўваць, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Ён таксама нагадаў аб магчымасці патаннення крэдытных рэсурсаў пад праекты, якія прадугледжваюць будаўніцтва новых малочнатаварных ферм. «На 1 студзеня мы будзем мець 207 новых ферм за два гады, з улікам таго, што за ўсю мінулую пяцігодку ўвялі 215 такіх аб'ектаў», — сказаў ён.

У цэлым прэм'ер-міністр адзначыў, што задачы, якія абмяркоўваюцца, даволі складаныя, аднак у гэтым выпадку мэта апраўдвае сродкі. Беларусі трэба будзе выйсці на вытворчасць 10 млн.т малака ў 2015 годзе. Пакуль гэты аб'ём складае 6,5 млн.т. «У прынцыпе пастаўленыя задачы рэальна выканаць», — лічыць Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго слоў, для гэтага неабходна выкананне трох асноўных умоў. Першая — гэта фарміраванне сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базы, стварэнне новых ферм. Пры гэтым вельмі важна палепшыць умовы для жывёлаводаў у вёсцы. Паралельна трэба вырашаць і пытанні забеспячэння рэканструюемых і новых малочнатаварных ферм збалансаванымі кармамі. «Можна зрабіць цудоўныя фермы, абсталяваныя даільнымі заламі, але калі жывёлы будуць утрымлівацца галоднымі, аб якім дакормліванні можа ісці размова? — задаў слушнае пытанне прэм'ер-міністр. — Таму пытанні кормавытворчасці не менш актуальныя, чым стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы». Акрамя таго, трэба будзе ўкамплектаваць малочнатаварныя фермы дойным статкам. Гэта пытанне актуальнае не толькі для ферм, якія рэканструюцца але і новых. «Паводле інфармацыі, якую мы маем, фермы, уведзеныя ў строй 1-2 гады таму, не да канца ўкамплектаваны, а аблвыканкамы дрэнна працуюць па гэтым пытанні», — канстатаваў ён.

Асаблівую ўвагу Міхаіл Мясніковіч звярнуў на неабходнасць выкаранення безгаспадарчасці ў жывёлагадоўлі. У якасці прыкладу ён прывёў даведку Камітэта дзяржкантролю аб выбыцці буйной рагатай жывёлы ў сельгасарганізацыях. «Не трэба ўводзіць у зман, што гэта плануемае выбыццё, што жывёлы выпрацавалі свой рэсурс і не могуць выкарыстоўвацца ў малочнай жывёлагадоўлі. Факты сведчаць аб адваротным. Гэта махровая безгаспадарчасць на месцах», — адзначыў прэм'ер-міністр. Ён запатрабаваў прыняць меры для вырашэння гэтых пытанняў.

БЕЛТА

■ Выбары-2012

ЦВК: ВЫСТУПЛЕННІ ЧАТЫРОХ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ НЕ АДПАВЯДАЮЦЬ ВЫБАРЧАМУ КОДЭКСУ

Наглядальны савет па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў СМІ прызнаў, што перадвыбарныя выступленні чатырох кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання не адпавядаюць выбарчаму заканадаўству краіны. Інфармацыя аб гэтым размешчана на сайце Цэнтрвыбаркама.

Наглядальны савет 27 жніўня разгледзеў звароты тэлеканала «Беларусь 2», ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» і тэлерадыёкампаніі «Магілёў» аб адпаведнасці патрабаванням выбарчага заканадаўства перадвыбарных выступленняў чатырох кандыдатаў у дэпутаты. Члены савета прагледзелі прадстаўленыя відэазапісы тэлевыступленняў. «Наглядальны савет адзначае, што прадстаўленыя выступленні не могуць быць аднесены да перадвыбарнай агітацыі, паняцце якой вызначана ў артыкуле 155 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь», — гаворыцца ў паведамленні на сайце Цэнтрвыбаркама.

Закон растлумачвае, што перадвыбарная агітацыя — «гэта дзейнасць, якая мае за мэту схіліць або схіляе выбаршчыкаў да ўдзелу ў выбарах, галасаванню за тых ці іншых кандыдатаў ці супраць іх».

«Мэтай прадстаўленых выступленняў з'яўляецца агітацыя супраць удзелу ў выбарах, пры гэтым кандыдаты ў дэпутаты адмаўляюцца балатавацца, фактычна анулюючы прысвоены ім статус кандыдатаў у дэпутаты», — сказана ў паведамленні на сайце ЦВК.

Наглядальны савет лічыць, што матэрыялы, якія не адпавядаюць патрабаванням выбарчага заканадаўства, не могуць быць прадстаўлены ў якасці перадвыбарных агітацыйных матэрыялаў.

«Права на бясплатныя выступленні па дзяржаўным тэлебачанні і радыё прадстаўляюцца кандыдатам у дэпутаты для вядзення перадвыбарнай агітацыі і выкарыстанне гэтых магчымасцяў для іншых мэт законам не прадугледжана», — растлумачылі ў ЦВК.

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ ЗАВЯРШАЕЦЦА

Завяршаецца вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання.

Вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі пачалося 2 жніўня і ў адпаведнасці з планам павінна завяршыцца 31 жніўня.

Правядзенне гэтага этапу выбарчай кампаніі — задача раённых, а ў гарадах абласнога падпарадкавання — гарадскіх Саветаў дэпутатаў і раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтаў, а таксама Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і Мінгарвыканкама.

Далей абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты павінны ў трохдзённы тэрмін прадставіць у ЦВК дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі для рэгістрацыі, якая пройдзе з 1 па 5 верасня ўключна.

Членаў верхняй палаты парламента выбіраюць шляхам тайнага галасавання на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага ўзроўню ў кожнай вобласці і дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета. Выбары ў Савет Рэспублікі павінны прайсці з 6 па 25 верасня ўключна.

Вынікі выбараў будуць падведзены не пазней за 5 каст рычніка ўключна. Да гэтага часу адбудзецца таксама рэгістрацыя выбраных членаў Савета Рэспублікі.

БЕЛТА

■ Прамая лінія

Міністр абароны Рэспублікі Беларусь, генерал-лейтэнант Юрый Віктаравіч ЖАДОБІН 31 жніўня правядзе прамую тэлефонную лінію з насельніцтвам.

Задаць пытанне міністру абароны можна будзе з **10.00 да 11.00 па тэлефоне (8 017) 297 29 20.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

НОВЫЯ ПАМЯТНЫЯ МАНЕТЫ ДА СТАГОДДЗЯ МАКСІМА ТАНКА

Нацыянальны банк сёння ўводзіць у абарачэнне памятныя манеты «Максім Танк. 100 гадоў»: сярэбраную — наміналам 10 рублёў, пробай сплаву 925, масай 16,81 грама, дыяметрам 37 міліметраў, і медна-нікелевую — наміналам 1 рубель, масай 19,50 грама, дыяметрам 37 міліметраў. Абедзве манеты адчаканены на ЗАТ «Літоўскі манетны двор», Вільнюс, Літва. Сярэбраная мае якасць «пруф», медна-нікелевая — «пруф-лайк». Тыраж кожнай — па 2000 штук.

БЯСПЛАТНЫ ПРАЕЗД У ТРАНСПАРЦЕ СТАЛІЧНЫМ СТУДЭНТАМ ВЯРТАЦЬ НЕ ПЛАНУЕЦЦА

Бясплатны праезд у грамадскім транспарце Мінска захаваецца толькі для школьнікаў. Аб гэтым паведаміў на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме дырэктар ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый Шкуратаў.

Як адзначыў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька, неабходнасці ў вяртанні такой жа льготы для студэнтаў няма. «У мінулым годзе, улічваючы няпростую эканамічную сітуацыю, мы прынялі рашэнне падтрымаць навучэнскую моладзь. Цяпер эканамічная абстаноўка і ўзровень даходаў насельніцтва змяніліся», — растлумачыў ён. Паводле слоў Мікалая Ладуцькі, у сталіцы для маладых людзей існуе шмат магчымасцяў для падзаработку ў вольны ад вучобы час. Ёсць вакансіі ў сферы паслуг, гасцінічнага бізнэсу, высокіх тэхналогій, будаўніцтва і інш. «Неабходна стварыць умовы для працаўладкавання моладзі. Студэнцкія атрады не павінны завяршыць работу 1 верасня, а прадаўжаць сваю дзейнасць», — сказаў старшыня Мінгарвыканкама.

Бясплатны праезд у грамадскім транспарце Мінска для студэнтаў і навучэнцаў дзённай формы навучання ўстаноў сталіцы, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, адмянілі з 1 ліпеня 2012 года.

Адмена льготы не распаўсюджваецца на навучэнцаў сярэдніх агульнаадукацыйных школ горада — школьнікі, як і раней, маюць права праезду ў грамадскім транспарце сталіцы бясплатна. Кожны дзень грамадскім транспартам Мінска перавозіцца амаль 2 млн пасажыраў. З верасня чакаецца павелічэнне пасажырапатоку.

ДАІ МІНСКА ПРАВОДЗІЦЬ КОМПЛЕКС МЕРАПРЫЕМСТВАЎ «УВАГА — ДЗЕЦІ!»

Дзяржаўтаінспекцыя Мінска з 27 жніўня па 10 верасня правядзіць спецыяльны комплекс мерапрыемстваў «Увага — дзеці!».

«Аналіз аператыўнай абстаноўкі ў сферы дарожнага руху сведчыць аб тым, што ў жніўні-верасні абвастраецца праблема дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму. З удзелам дзяцей за сем месяцаў бягучага года ў Мінску адбылося 40 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 41 дзіця атрымала траўмы і калецтвы», — растлумачылі ў ГУУС.

У акцыі «Увага — дзеці!» будуць задзейнічаны супрацоўнікі ўсіх падраздзяленняў міліцыі грамадскай бяспекі сталіцы. У час правядзення мерапрыемства ДАІ ўсім вадзіцелям рэкамендуе ехаць з уключаным блізкім святлом фар для прыцягнення ўвагі маленькіх удзельнікаў дарожнага руху.

БЕЛТА.

ВЫРАТАВАЛІ ДВОЙЧЫ ПА ТЫМ ЖА СЦЭНАРЫІ

У Бабруйску работнікі МНС другі раз з пачатку года выратавалі пажылую жанчыну, якая забралася на парапет чацвёртага паверха.

Пра тое, што там сядзіць чалавек, зноў паведаміла суседка з дома насупраць. Літаральна праз пяць хвілін выратавальнікі былі на вуліцы 50 гадоў ВЛКСМ. Паводле слоў жанчыны, яна вырашыла, што яе зачынілі, вылезла праз акно на парапет звонку будынка, села на яго і збіралася скочыць. Работнікі МНС адчынілі акно і ўцягнулі яе ў памяшканне. Гэтую ж жанчыну такім жа чынам ужо ратавалі ў сярэдзіне студзеня.

ЗАБЛУКАЛІ Ў ЛЯСАХ

За суткі ў лясах краіны згубіліся тры чалавекі.

— Усе яны пенсіянеры: дзве жанчыны і мужчына, — паведаміў «Звяздзе» старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — 80-гадовы пенсіянер згубіўся паблізу вёскі Ванялевічы Капыльскага раёна — каля 15 гадзін пайшоў у лес за 50 метраў ад вёскі і не вярнуўся дадому. Шукалі пенсіянера выратавальнікі і міліцыянеры. Толькі пасля апоўначы работнікі МНС знайшлі яго. Стан мужчыны здавальняючы, ад шпіталізацыі ён адмовіўся.

На момант падрыхтоўкі матэрыялу 74-гадовую жанчыну, якая згубілася ў лясным масіве паблізу вёскі Лазавец Маладзечанскага раёна, пакуль яшчэ не знайшлі. Пра здарэнне паведаміла суседка, якой пенсіянерка пазваніла па мабільным тэлефоне і сказала, што не можа знайсці дарогу назад. Жанчыну самастойна шукалі мясцовыя жыхары. Да іх далучыліся выратавальнікі, міліцыянеры, леснікі і 25 вайскоўцаў.

Увечары стала вядома, што ў лесе паблізу вёскі Збышын Кіраўскага раёна заблукала 66-гадовая пенсіянерка, якая пайшла ў грыбы. Месцазнаходжанне яе пакуль невядомае. У пошуках бяруць удзел 10 работнікаў Кіраўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях і 7 супрацоўнікаў мясцовага РАУС.

У двух апошніх выпадках пошукі будуць падоўжаны.

ГАРЫЦЬ САЛОМА, ГАРЫЦЬ СЕНА...

Было каля трох гадзін ночы, калі ў Слуцкі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях паведамілі, што паблізу вёскі Прошыцы ў полі гарыць сцірта саломы.

— Агонь знішчыў 100 тон, яшчэ 200 тон саломы, якая належала падсобнай гаспадарцы «Наша Ніва» ААТ «Слуцкі мясакамбінат», было выратавана, — паведамілі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — Прычыны пажару і матэрыяльны ўрон удакладняюцца.

У гэтую ж ноч згарэла сенасховішча ў вёсцы Бытча Барысаўскага раёна. Агонь знішчыў і 24 тоны сена сёлетняй нарыхтоўкі. Прычыны пажару таксама высвятляюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БАНКРУЦТВА БЫВАЕ ЎДАЛЫМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ва ўсіх краінах свету, дзе існуе заканадаўства аб банкруцтве і практыка яго прымянення, адзначаецца, што завяршаецца судовая працэдура банкруцтва ў большасці выпадкаў (ад 85% да 95%) ліквідацыяй юрыдычнай асобы або спыненнем дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка. Тлумачыцца такая статыстыка рознымі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прычынамі. Галоўная з іх у тым, што да судовай працэдуры банкруцтва даводзяцца ў асноўным толькі «цяжкія выпадкі» неплацельшчыкаў. Асноўная ж іх маса праходзіць пазасудовыя працэдуры санацыі або ліквідацыі, калі пакаznікі бізнэсу знаходзяцца на ўзроўні неадмоўных велічынь. Акрамя таго, судовыя працэдуры банкруцтвы заўсёды доўгія па часе.

І толькі астатнія 5—15% могуць уяўляць сабою тыя арганізацыі і прадпрымальнікаў, якія выйшлі з судовай працэдуры банкруцтва паспяхова, з аздараўленнем эканомікі, з аднаўленнем плацежаздольнасці і адпавядаюць іншым крытэрыям дабрабыту. Але і гэтыя лічбы сведчаць аб высокай эфектыўнасці судовых працэдур банкруцтва, калі забяспечваецца канструктыўнае ўзаемадзеянне і паразуменне асоб, якія ўдзельнічаюць непасрэдна і апасродкавана ў працэдуры банкруцтва (кіраўніка, крэдыторaў, органаў выканаўчай улады, гаспадарчага суда, банкаў і іншых). Такія выпадкі заслугоўваюць адмысловай увагі і папулярызацыі, каб, па-першае, пераняць станоўчы досвед, а па-другое, не паўтарыць адмоўны.

Адзін з прыкладаў паспяховай санацыі, праведзенай у рамках конкурснай вытворчасці, уяўляе сабой **камунальнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Калінкавіцкі мэблевы камбінат».** Гэта адно з найстарэйшых прадпрыемстваў Гомельшчыны, якое сваю дзейнасць распачало яшчэ ў 1938 годзе. Сёння мэблевы камбінат з'яўляецца дзяржаўным прадпрыемствам і з чэрвеня 2009 года на праве ўласнасці належыць Калінкавіцкаму райвыканкаму.

Разгледзім больш падрабязна этапы аднаўлення прадпрыемства.

Увядзенне санацыі

У 2001 годзе пастановай гаспадарчага суда Гомельскай вобласці ад 26.11.2001 у дачыненні да Калінкавіцкага мэблевага камбіната была заведзена вытворчасць па справе аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) і вызначаны абаронны перыяд. Радыкальных вынікаў гэты перыяд не даў, і пастановай таго ж гаспадарчага суда ад 20.12.2001 у дачыненні да гэтага даўжніка была адкрыта конкурсная вытворчасць. Амаль праз паўгода рашэннем гаспадарчага суда Гомельскай вобласці ад 14.06.2002 мэблевы камбінат быў прызнаны эканамічна неплацежаздольным, у дачыненні да яго ўведзена працэдура санацыі (аздараўлення), тэрмін якой з улікам неаднаразовага падаўжэння гаспадарчым судом быў вызначаны да 29.12.2008.

Гэтыя гады, адведзеныя гаспадарчым судом для фінансавага аздараўлення прадпрыемства, сталі гадамі стараннай працы па планамерным і паслядоўным аднаўленні камбіната. Кожны раз, выносячы пастанову аб падаўжэнні тэрміну санацыі, гаспадарчы суд улічваў канструктыўны вынік.

На перыяд адкрыцця санацыі тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці быў невысокі і складаў 59,4% да ўзроўню 2000 года. У 2001 годзе камбінатам было выпушчана прадукцыі на суму ўсяго 500 млн руб., а страта складала 126 млн руб. Усе вырабы былі стратнымі з узроўнем ад 6% да 30%. Рэнтабельнасць складала мінус 25,4%. Недахоп абаротных сродкаў ускладняў набыццё сыравіны непасрэдна ў яе вытворцаў, не дазваляў разлічвацца за электраэнергію, своечасова выплачваць заработную плату.

У пастанове аб распачынанні конкурснай вытворчасці ад 20.12.2001 гаспадарчы суд Гомельскай вобласці канстатаваў на мэблевым камбінаце наяўнасць каэфіцыента бягучай ліквіднасці ў памеры 0,59 (пры нарматыве 1,7), а каэфіцыент забяспечанасці ўласнымі сродкамі складаў тады мінус 0,72 (нарматыў — 0,3). Гэтыя аб'ектыўныя паказчыкі назіраліся на працягу чатырох кварталаў і сведчылі аб нездавальняючай структуры бухгалтарскага балансу і ўстойлівай неплацежаздольнасці камбіната. Адначасова з распачынанням конкурснай вытворчасці з санацыяй гаспадарчы суд у адпаведнасці з арт.арт. 90 — 91 Закона аб банкруцтве абвясціў мараторый на эканамічныя санкцыі і патрабаванні крэдытораў.

Стаўка на тэхнічнае пераабсталяванне

З пачатку працы ва ўмовах санацыі сродкі падатковага крэдыту (сродкі, захаваныя дзякуючы мараторыю на выплату падаткаў, уведзенаму гаспадарчым судом) кіраўніком накіроўваліся на развіццё вытворчасці. Кіраўніком сумесна з крэдыторамі, выканкамам была вызначана стратэгія развіцця камбіната. Асноўнымі яе кірункамі сталі павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці, прыцягненне інвестыцый, памяншэнне вытворчых выдаткаў і эфектыўнае кіраванне фінансавымі патокамі. Асобна варта адзначыць выбраны курс на тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці. Прычым першапачаткова прысутнічала разуменне таго, што гэты працэс будзе доўгатэрміновым, дарагім, але выніковым. Замена маральна састарэлага зношанага абсталявання павінна была дазволіць павялічыць аб'ёмы вытворчасці, абнавіць асартымент прадукцыі, якая выпускаецца, павысіць прадукцыйнасць працы.

Ужо пачынаючы з 2002 года і па цяперашні час штогод аб'ём вытворчасці павялічваецца больш чым на 30%, адначасова на 30% абнаўляецца асартымент выпускаемай прадукцыі.

Гаспадарчы суд, шматразова падаўжаючы санацыю камбіната, кантраляваў яе ход і выкананне сваіх абавязкаў антыкрызісным кіраўніком. Так, у 2003 годзе вынесена пастанова аб падаўжэнні тэрміну санацыі на адзін год (пастанова ад 15.12.2003). Гаспадарчы суд улічыў усе станоўчыя вынікі, адлюстраваныя ў справаздачы кіраўніка. У чарговы раз за перыяд пасля ўвядзення санацыі мэблевы камбінат павялічыў аб'ёмы вытворчасці і рэалізацыі гатовай прадукцыі ў 2 разы, адначасова знізіўшы выдаткі на выраб прадукцыі (за 2002 год на 14,1%, за 9 месяцаў 2003 года — на 9%), скараціўшы страты прадпрыемства ў 2,6 раза і атрымаўшы прыбытак у памеры 6,5 млн руб. Але рост крэдыторскай запазычанасці не дазваляў цалкам аднавіць плацежаздольнасць.

З 2004 года камбінат, рэалізуючы курс на тэхнічнае пераабсталяванне, пачаў набываць сучаснае абсталяванне, у тым ліку станкі з лічбавым праграмным кіраваннем (ЛПК). Удалося прыцягнуць інвестыцыі ў асноўны капітал (за гэты перыяд іх прыток склаў больш за 4,3 млрд руб.).

Укараненне новага абсталявання і праведзеная мадэрнізацыя абсталявання дазволілі павысіць прадукцыйнасць працы, зэканоміць электраэнергію, асвоіць новыя віды прадукцыі, скараціць адходы вытворчасці. Усё гэта ў комплексе прывяло да пазітыўнай змены структуры выдаткаў на вытворчасць: знізіла працоўныя і энергетычныя выдаткі ў сабекошце прадукцыі. Вызваленыя фінансавыя сродкі былі накіраваны на набыццё сучаснай сыравіны і мэблевай фурнітуры.

У студзені 2005 года гаспадарчы суд, падаўжаючы ў чарговы раз тэрмін санацыі, прымае да ўвагі поспехі прадпрыемства. На прадпрыемстве адбыўся рост аб'ёмаў вытворчасці (у 2003 годзе на 138,7%, у 2004 годзе на 119,3%), пашыраны рынкі збыту прадукцыі, зноў знізіліся выдаткі на вытворчасць (у 2003 годзе на 8,7%, за 9 месяцаў 2004 года на 4%). Падаткаабкладаемы прыбытак за 11 месяцаў 2004 года склаў ужо 101 млн руб. (дарэчы, за 2006 год прыбытак склаў ужо 485 млн руб., а за 10 месяцаў 2007 года — 541 млн руб.). Адной са значных заслуг з'явілася захаванне колькасці працаўнікоў на мэблевым камбінаце. Яна засталася практычна нязменнай.

Прадпрыемства адноўлена

Разгледжаны прыклад дазваляе ацаніць ролю гаспадарчага суда ў паспяховым завяршэнні справы аб банкруцтве. Не ўмешваючыся ў вытворчы працэс, суд штогод кантраляваў працэс санацыі прадпрыемства-даўжніка. Фіксуючы станоўчую дынаміку эканамічных паказчыкаў даўжніка, якія дазваляюць зрабіць выснову аб аднаўленні яго плацежаздольнасці, гаспадарчы суд заканамерна і аб'ектыўна, а не фармальна падаўжаў тэрміны яго санацыі.

Аднавіць прадпрыемства, зрабіць яго рэнтабельным і плацежаздольным дазволіў комплекс захадаў, зробленых кіраўніком і калектывам камбіната за васьмігадовы перыяд санацыі (2001—2009 гг.). У 2009 годзе гаспадарчы суд Гомельскай вобласці вызначыў тэрмін канчатковага разліку з крэдыторамі да 28.01.2010. А ўжо пастановай ад 18.12.2009 вытворчасць па справе аб банкруцтве была спынена, бо даўжнік з крэдыторамі разлічыўся цалкам.

Пацвярджэннем далейшага паспяховага лёсу мэблевага камбіната стаў той факт, што і ў 2011 годзе, і сёлета гаспадарчым судом Гомельскай вобласці справы з удзелам мэблевага камбіната не разглядаліся. І гэта не выпадкова.

Сёння Калінкавіцкі мэблевы камбінат — паспяховае, фінансава ўстойлівае прадпрыемства, здольнае своечасова рабіць разлікі. Асартымент прадукцыі (спальні, мэбля для дзіцячых пакояў, мэбля для гасцёўняў, шырокі асартымент шаф, стэлажоў, сталоў) дазваляе займаць годнае месца на рынку. Тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці працягваецца: у 2011 годзе ў яго ўкладзена 4,8 млрд руб., інвестыцыі склалі 11 млрд рублёў. Пабудаваны новы цэх па выпуску мэблі, пры гэтым удзельная вага пашыранага асартыменту склала за студзень—май 2012 года 27,9%. Рэнтабельнасць продажаў склала 20,8%.

Варта адзначыць, што экспартныя пастаўкі ў студзені—маі 2012 года склалі 2,5 млн долараў ЗША і павялічыліся ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага года на 381,6%. Калінкавіцкая мэбля вядомая ў краінах Мытнага саюза — суседняй Расіі, Казахстане. Вядзецца праца па засваенні новых рынкаў збыту.

Сярэднямесячная намінальная зарплата на камбінаце — 3,6 млн руб. На прадпрыемстве вырымліваюцца суадносіны росту прадукцыйнасці працы (295,3%) і сярэдняй зарплаты (236,1%). За выкананне асноўных аператыўных паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця ў 2011 годзе сярод прамысловых арганізацый Беларусі камбінат заняў першае месца і занесены на Рэспубліканскую Дошку гонару.

Шлях прадпрыемства да аднаўлення быў цяжкім, доўгім, але таго каштаваў.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі з заўчаснай смерцю народнага артыста Беларусі НАВУМЕНКІ Якава Паўлавіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

Мундзіры, ядры, бакенбарды

На выставе ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі пахне шакаладам і ваніллю. Хоць тэма выставы вельмі сур'ёзная — «1812-ы: погляд праз два стагоддзі» — дэталі надаюць гістарычнай карцінцы «жывы» аб'ём.

Зірнуць на вайну 1812 года дапамагаюць высакародныя постаці таго часу, але сярод іншых ваяроў на выставе найбольш Напалеона. Французскі імператар тут прысутнічае не толькі ў гравюры, фарфоры, бронзе і нават вініле на выставачных планшэтах, але і ў шакаладзе — у ядомай (ужо, на жаль, умоўна ядомай!) кампазіцыі магілёўскага кандытара.

Вайскоўцы: погляд праз два стагоддзі.

Гавораць, што гэтая вайна, як ніякая іншая, была прыгожая. Маецца на ўвазе, вядома, не рэальныя кроў і пот, але адлюстраванне вайсковага падзвігу ў мастацкіх творах. На партрэтах таго часу — статныя прыгажуны са строгімі поглядамі, у мундзірах з высокімі, расшытымі золатам каўнярамі і шыкоўнай зброяй.

Стрэльбы, шпагі і шаблі на выставе прадстаўлены, але найбольш жахлівае ўражанне робіць нешта падобнае на вялізны меч з зазубінамі: аказалася, што якраз да баёў ён дачынення не мае. Гэта сапёрны цясак, і выкарыстоўваўся ён пры земляных работах — у прыватнасці, у Бабруйскай крэпасці.

На выставе паказаны не толькі французы і рускія як праціўнікі ў вайне 1812 года, але і Магілёўшчына, па якой пракацілася гэтая вайна, і ўвогуле тая ўжо далёкая эпоха.

— У нас тут шмат сапраўдных прадметаў, якія маюць дачыненне да таго часу, — расказала вядучы навуковы супрацоўнік музея Марына Тарасава. — Калі падлічыць усё, нават дробязі, то будзе з паўтысячы экспанатаў з фондаў нашага музея і прыватных калекцый.

У вітрынах выстаўлены рэчы пачатку XIX стагоддзя. Уразіў плюмаж да генеральскай шпагі з яркім чорна-жоўтым пер'ем пеўня. Можна ўбачыць самыя розныя дробязі, якія праляжалі ў зямлі дзвесце гадоў на полі бою пад вёскай Салтанаўка Магілёўскага раёна, дзе ў 1812 годзе была вялікая бітва, і пры гэтым даведацца, што ў французскіх калекцыях ёсць і зусім мірныя рэчы: чайнік з галавой грыфона ў стылі ампір і фарфоравы соуснік у выглядзе лебедзя. Стыльная шкляная чарка і маленькі, амаль цацачны, кубак, знойдзеныя ў ваколіцах Магілёва. Кажуць, што з такіх пасудзін, як, прынамсі, гэты кубачак, французы маглі піць каву ў карчме ў Палыкавічах пад Магілёвам: напэўна, варыянт цяперашняга «эспрэса».

Увогуле такую выставу нельга праглядзець за дзясятак хвілін і атрымаць хуткае задавальненне: патрэбны час і ўвага, каб без спешкі ўсё прачытаць, разгледзець і ацаніць. Вось на сценах — старадаўнія літаграфіі, нават расфарбаваныя, кожная з якіх — яркі і змястоўны мастацкі твор.

Напрыклад: «Каля Бешанковічаў, 28 ліпеня 1812 года, 5 раніцы». Царква на пагорку, армейскае пастраенне, салдаты, гарматы, на першым плане качаецца конь. Ваенная, але ўсё яшчэ мірная, раніца.

— Гэта цудоўная літаграфія са збору прыватнага калекцыянера, — расказвае Марына. — Аўтар — афіцэр Фабер дзю Фор, які ішоў разам з арміяй Напалеона на Віцебск і рабіў замалёўкі. Пасля вяртання дадому француз іх выдаў, і яны сталі вельмі папулярнымі ў Еўропе.

Выявы Іосіфаўскага сабора ў Магілёве, аказваецца, вельмі дарэчы на гэтай выставе. Цяпер, гэтага сабора няма: за савецкім часам яго знішчылі, а на гэтым месцы пабудавалі гасцініцу «Днепр», дзе сёння здаюцца офісы. Але ў 1812 годзе ў саборы, як і ў іншых цэрквах Магілёва, маліліся не за расійскага імператара, а за Напалеона. Магілёўская царкоўная смута потым доўга расследавалася.

— Дарэчы, шляхі гісторыі цяжка прадказаць, — каментуе Тарасава. —У выніку гэтага следства ў Спаскі манастыр быў змешчаны малады ігумен Арэст, дзе ён напісаў свае «Запіскі», якія цяпер — важная крыніца па гісторыі Магілёва.

Кнігі, якія былі выдадзены ў Расійскай імперыі да 100-гадовага юбілею Айчыннай вайны, уражваюць сваёй разнастайнасцю: альбом малюнкаў, шматтомнік навуковых даследаванняў, успаміны ўдзельнікаў, песні, карыкатуры. Спрычыніўся да гэтага і настаўнік Магілёўскай мужчынскай гімназіі, які выдаў сваю кнігу пра 1812 год.

Увогуле навуковы складнік выставы ў Магілёве — гэта дакументы Нацыянальнага архіва Беларусі. Некаторыя з іх экспануюцца ўпершыню.

— Паглядзіце, тут гадзінамі можна чытаць, — паказвае Марына Тарасава. — Дакумент пра ўрон, якія ўчынілі французскія

Напалеон у шакаладзе.

войскі Гора-Горацкаму графству. Ад тысяч рублёў і галандскай жывёлы да мукі жытняй і круп розных, і так да апошняга цвіка. І ўсё гэта з каментарыямі чыноўнікаў, скрупулёзна пра кожную капейку на 9 лістах — вельмі павучальнае чытанне.

Ад верасня да наведвання выставы «1812-ы: погляд праз два стагоддзі» далучацца старшыя школьнікі. Для таго, каб утрымаць увагу падлеткаў, напрыклад, прадстаўлены фрагмент генеральнай карты тэатра вайны 1812 года.

— Карта прыкладзена да кнігі выдання 1838 года, — растлумачыла навуковы супрацоўнік музея. — Яна захоўваецца ў нашых фондах, але з-за дрэннай захаванасці экспанаваць яе немагчыма. Таму зрабілі вялізнае фота, дзе кожны можа прачытаць знаёмыя назвы населеных пунктаў Магілёўшчыны, усвядоміць, што тэатр вайны быў тут, на нашай зямлі.

Несумненна, што ўвагу школьнікаў прыцягнуць каляровы рускі лубок ваеннага часу, насуперак усім ваенным жахам — гумарыстычны: як, напрыклад, паводзілі сябе французы ў пакінутай Маскве. Салдат, які есць кавун на канапе сярод гарадскіх руін, у спалучэнні з каментарыямі экскурсавода пра вялікае здзіўленне нязваных гасцей наконт колькасці... варэння ў маскоўскіх дамах.

Такім чынам, выстава ў Магілёўскім краязнаўчым музеі павінна адарыць маладое пакаленне цікавымі ўражаннямі і новымі ведамі.

— Мне падаецца, што яны павінны захапіцца подзвігам салдат, якія змагаліся, — лічыць Марына Тарасава. — Гісторыя гэтай вайны вучыць: трэба ўмець своечасова спыніцца ў сваіх вялікіх амбіцыях. Калі б Напалеон не рушыў узімку ў Расію, то, можа, сусветная гісторыя пайшла б па зусім іншым шляху?

І на заканчэнне расповеду пра 1812 год трэба адзначыць пераемнасць эпох і актуалій моды. Праз дзвесце гадоў высокія каўняры з упрыгажэннямі (вядома, у сучасным варыянце) зноў сталі модныя, як і жакеты з гузікамі накшталт вайсковых, а вузкія штаны з лампасамі захапілі сусветныя подыумы і буцікі.

— А пра бакенбарды і вусы ваенных можна напісаць вялікую працу, — смяецца Марына. — Іх за тым часам то дазвалялі, то забаранялі, у залежнасці ад меркавання высокага начальства...

Але самае цікавае, што сёння бакенбарды ўжо не выглядаюць як нонсенс: пры праглядзе галерэі партрэтаў пачатку XIX стагоддзя неяк міжволі згадваецца, як эфектна трапяталі на паветры бакенбарды англійскага пераможцы знакамітай велагонкі «Тур дэ Франс» Брэдлі Уігінса. Часіны мяняюцца, але часам і вяртаюцца ў гістарычных дэталях.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Ірыны САВОСІНАЙ і аўтара.

Медальёны ў памяць вайсковых падзей.

■ Беларусь і свет

ЯПОНЦЫ ЗАЦІКАВІЛІСЯ БЕЛАРУСКІМІ ТЭХНАЛОГІЯМІ РАДЫЯЦЫЙНАГА КАНТРОЛЮ

Год таму завяршыўся праект «Мадэрнізацыя сістэмы процідзеяння незаконнаму абароту ядзерных і радыеактыўных матэрыялаў на Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь» (РАДБЕЛ). Ён рэалізоўваўся Дзяржпагранкамітэтам Беларусі і ўрадам Японіі. У беларускіх СМІ ўжо нямала пісалі аб тым, што даў праект Беларусі. Японскі эксперт Сансіра Хасака , які курыраваў праект, расказвае, што ў сваю чаргу атрымала Японія ад супрацоўніцтва з беларускім бокам у гэтай сферы.

— Пан Хасака, беларуска-японскі праект РАДБЕЛ быў звязаны з кантролем радыяцыі. Ці дапамог ён Японіі пасля таго, як здарылася трагедыя на АЭС «Фукусіма»?

— Ніхто не мог прадбачыць такую катастрофу, калі мы пачыналі праект. Тым не менш гэта адбылося, і пасля завяршэння праекта РАДБЕЛ мы ўбачылі, што супрацоўніцтва дало ў добрым сэнсе пабочныя эфекты.

Паводле інфармацыі Дзяржпагранкамітэта Беларусі, апошні год яны прымалі ў сябе многіх прадстаўнікоў Японіі, у тым ліку даследчыкаў, журналістаў, прадстаўнікоў улад. Была сярод іх і дэлегацыя прэфектуры Фукусіма. У час гэтых візітаў японцы наведвалі вучэбную аўдыторыю, у якой можна было азнаёміцца з беларускімі тэхналогіямі маніторынгу радыяцыі. Кожны, хто прыехаў з Японіі, меў магчымасць прайсці індывідуальнае дазіметрычнае абследаванне ў адной з мабільных лабараторый, створаных дзякуючы праекту РАДБЕЛ.

З самага пачатку праект прызначаўся для Беларусі, але нешта з РАДБЕЛ аказалася карысным і для нас. Мы вельмі ўдзячны нашым партнёрам з беларускай пагранслужбы за тое, што яны былі такімі гасцінnымі з кожнай японскай дэлегацыяй, а таксама за жаданне дзяліцца ведамі і вопытам, атрыманымі ў час штодзённай работы ў зонах, што пацярпелі пасля аварыі ў Чарнобылі.

Наколькі нам вядома, многія японскія эксперты, якія пабывалі ў Беларусі, зацікавіліся беларускім досведам па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Акрамя таго, спецыялісты з Беларусі прыязджаюць цяпер у Японію, каб падзяліцца практычнымі рашэннямі ў сітуацыі пасля аварыі ў Фукусіме.

— Што менавіта з беларускага вопыту рэалізацыі РАДБЕЛ выкарыстала ваша краіна?

— Беларусь — краіна, якая мяжуе з некалькімі дзяржавамі. І гэта менавіта сухапутныя межы. Японія ж, як вядома, акружана вадой з усіх бакоў. Таму, працуючы па праекце, мы многаму навучыліся ў пагранічнай службы. Гэта асаблівасці эфектыўнага пагранічнага менеджменту. Гэта ўнікальныя падыходы да радыяцыйнага кантролю на граніцы і забеспячэння радыяцыйнай бяспекі асабовага складу і жыхароў раёнаў, заражаных пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Дарэчы, ідэя разгортвання мабільных лабараторый у рамках РАДБЕЛ належыць пагранічнікам.

Для нашага праекта мы выкарыстоўвалі тэхналогіі вымярэння радыяцыі добра вядомых беларускіх фірм, такіх як «Атамтэх» і «Полімайстар». Пры выбары ўлічвалася, што многія пагранічнікі ўмеюць абыходзіцца з прыборамі гэтых вытворцаў. Акрамя таго, абсталяванне высокаінтэгравана з ІТ-тэхналогіямі. У хуткім часе такія ж прыборы (дэтэктары выпраменьвання, спектрометры выпраменьвання чалавека (СВЧ)) былі экспартаваны ў Японію з Беларусі ў вялікай колькасці. Гэтыя беларускія брэнды сталі даволі папулярныя ў нас не толькі сярод прафесіяналаў, але і жыхароў, якія сталі купляць персанальныя дазіметры пасля Фукусімы.

— Як вы ацэньваеце ўзровень супрацоўніцтва Беларусі і Японіі ў гэтай сферы? Ці мае намер японскі бок прадоўжыць узаемадзеянне з беларускімі калегамі?

— Двухбаковае супрацоўніцтва нашых дзяржаў у гэтай галіне мае дваццацігадовую гісторыю і пачалося яшчэ ў 1990-я гады, калі распаўся СССР і неадэкватная абарона ядзерных матэрыялаў і ўстановак у постсавецкіх краінах пачала выклікаць апасенні ў сусветнай супольнасці. У цеснай кааперацыі з МАГАТЭ на працягу 1990-х Японія зрабіла значны ўклад у стварэнне сістэмы ўліку і кантролю, а таксама фізічнай абароны ядзерных матэрыялаў у Беларусі.

Акрамя таго, пасля падзей 11 верасня ў Нью-Ёрку сталі больш актуальнымі тэрарыстычныя пагрозы ў галіне ядзернай бяспекі, уключаючы нелегальны транзіт ядзерных і радыеактыўных матэрыялаў праз граніцы дзяржаў. Спадзяёмся, у вырашэнні гэтай праблемы дапамог менавіта РАДБЕЛ. Я хацеў бы адзначыць, што ў прынцыпе забеспячэнне абароны ад ядзернага тэрарызму — гэта справа і адказнасць асобнай суверэннай дзяржавы. Але, як паказалі падзеі ў Фукусіме, інцыдэнт, які недзе адбыўся, становіцца агульнай праблемай. Мы павінны ўважліва адсочваць зменлівую абстаноўку і з'яўленне новых пагроз. Цяпер наша ўвага пераходзіць да пытання: «Наколькі паспяхова створаная сістэма спраўляецца з пастаўленымі задачамі?» У сувязі з гэтым мы плануем адправіць у Беларусь каманду, якая ацэніць, які эфект даў наш сумесны праект.

— Папрацаваўшы ў праекце РАДБЕЛ, што вы даведаліся аб чарнобыльскай трагедыі і як у вашай краіне можна выкарыстаць дослед пераадолення наступстваў таго выбуху?

— Аб Чарнобылі напісана вельмі шмат — і журналістамі, і вучонымі. Пасля аварыі ў Фукусіме ў Японіі чарнобыльская тэма зноў ажыла ў розных публікацыях, паказваючы рост цікавасці японскай аўдыторыі да гэтай праблемы. Праўда, ёсць некаторыя адрозненні ў сацыякультурным аспекце паміж Беларуссю і Японіяй, але ваша практыка, якой чвэрць стагоддзя, неацэнная. Добра адпрацаваныя і сістэмныя падыходы па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы і развіццю пацярпелых тэрыторый будуць карысны і для нас. У час рэалізацыі праекта мы былі прыемна ўражаны беларускімі тэхналогіямі і падыходамі. Я ўпэўнены, што японцы, якія наведваюць вашу краіну, будуць уражаны напрацоўкамі ў гэтай сферы. У сувязі з гэтым мы гаворым нашым суайчыннікам: «Лепш адзін раз убачыць...»

БЕЛТА.

ЗНІЖКІ ДЛЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ СВЯТА

У гандлёвай частцы рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2012», які пройдзе ў другой дэкадзе верасня ў г. Горкі, возьмуць удзел 40 арганізацый канцэрна «Беллегпрам».

У шырокім асартыменце яны прадставяць жаночыя паліто, мужчынскія касцюмы, жаночыя, дзіцячыя і мужчынскія кашулі, панчошна-шкарпэтачныя вырабы для дарослых і дзяцей.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Падкінулі задачку

ЛЕТНІЯ КАНІКУЛЫ — ПАД ПАГРОЗАЙ?

Матэматычную неадукаванасць выпускнікоў збіраюцца выпраўляць павелічэннем колькасці ўрокаў

Як палепшыць якасць ведаў школьнікаў па фізіцы і матэматыцы? У галоўным адукацыйным ведамстве краіны сёння спрабуюць знайсці адказ на гэтае пытанне. У чым прычына рэзкага зніжэння якасці падрыхтоўкі выпускнікоў: у адсутнасці ў іх матывацыі, у школьных праграмах, падручніках, недастатковай падрыхтоўцы школьных настаўнікаў або ў дэфіцыце часу, што адводзіцца ў школе на вывучэнне гэтых дысцыплін?

Не сакрэт, што ў апошнія гады сярэдні бал удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы і фізіцы зусім не радаваў ні школьных педагогаў, ні экзаменатараў. Так, па выніках ЦТ сёлетняга года сярэдні бал абітурыентаў, якія здавалі матэматыку, склаў па краіне 33,3 , а па фізіцы — 24,9. Дарэчы, летась сярэдні бал на ЦТ па матэматыцы быў яшчэ меншы — 21,6, а па фізіцы — 18,6. Няўжо намецілася станоўчая тэндэнцыя? Аднак, шчыра кажучы, сярэдні бал на цэнтралізаваным тэсціраванні можна смела параўнаць з сярэдняй тэмпературай па бальніцы. Насамрэч, абсалютная большасць прэтэндэнтаў на студэнцкі білет аказалася вельмі далёка ад такога паказчыку, як сярэдні бал на ЦТ: так, на тэсціраванні па фізіцы больш як 70% абітурыентаў набралі 20 балаў і менш, а па матэматыцы такіх было амаль 59% ад агульнай колькасці. Устаноўлены ў гэтым годзе парог у 7 балаў, які быў абавязковай умовай для ўдзелу ў конкурсе, не змаглі пераадолець амаль 19 тысяч удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Але сёння смела можна сказаць, што ўведзены парог апраўдаў сябе і стаў перашкодай для зусім слабых абітурыентаў толькі на чатырох дысцыплінах: найбольшая колькасць тых, хто не пераадолеў устаноўлены парог, прыпадае на матэматыку (10 274 чалавекі, або 11,3% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў) і фізіку (3956 чалавек, або 9,6%). На іншых дысцыплінах працэнт адсеяных быў зусім нязначны. З іншага боку, самая вялікая колькасць стабальных вынікаў была зарэгістравана сёлета менавіта на ЦТ па матэматыцы — 46 (у 2011 годзе — 33). Выходзіць, што тэсты не былі звышскладанымі, як пра гэта любяць паразважаць абітурыенты, якія засталіся ўнізе рэйтынгу прэтэндэнтаў на студэнцкі білет? Значыць, для выпускнікоў адных навучальных устаноў — не праблема справіцца з тэстам, але для іншых — праблема рашыць нават элементарныя задачы ў тэстах?

— На жаль, узровень ведаў беларускіх абітурыентаў па дзяржаўных мовах, матэматыцы і фізіцы хоць і супастаўны з паказчыкамі многіх еўрапейскіх краін, аднак усё роўна застаецца адносна невысокім, — дзяліўся сваім бачаннем сітуацыі на выніковай калегіі міністэрства ў студзені гэтага года міністр адукацыі нашай краіны Сяргей Маскевіч. — Аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання выявіў у ведах многіх абітурыентаў шэраг прабелаў, якіх, у прынцыпе, не павінна быць. Перад упраўленнямі адукацыі і Нацыянальным інстытутам адукацыі пастаўлена задача разабрацца ў прычынах памылак, якія абітурыенты дапускаюць, адказваючы на элементарныя пытанні ў тэстах, і прапанаваць дзейсныя захады па выпраўленні сітуацыі.

Да якіх высноў прыйшлі ў Нацыянальным інстытуце адукацыі і ці дайшлі да сапраўдных прычын, шырокай грамадскасці не паведамлялася. Але чарговае ЦТ, несумненна, падкінула кіраўнікам сістэмы адукацыі новую порцыю інфармацыі для роздуму. І вось літаральна днямі Сяргей Маскевіч заявіў пра тое, што ў Міністэрстве адукацыі разглядаецца магчымасць павелічэння працягласці навучальнага года:

— Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання паказваюць, што нашым вучням адназначна не хапае яшчэ адной гадзіны ў тыдзень па такіх прадметах, як фізіка і матэматыка. Значыць, нам трэба дабаўляць гадзіны ў вучэбную праграму. Таксама ўжо ў гэтым навучальным годзе істотныя сродкі будуць накіраваны на аснашчэнне лабараторным абсталяваннем школьных кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі, каб тыя адпавядалі самым сучасным патрабаванням.

Можна не сумнявацца, што і для школьнікаў, і для настаўнікаў навіна пра падаўжэнне навучальнага года прагучала як гром сярод яснага неба. Ва ўсялякім разе на жнівеньскай нарадзе сталічных педагогаў у Палацы Рэспублікі гэтае паведамленне ўзрушыла ўсіх прысутных у зале. З аднаго боку, працягласць школьных канікул у Беларусі — адна з самых вялікіх у свеце. Але, з іншага боку, усяго год таму быў прыняты Кодэкс аб адукацыі, у якім была занатавана працягласць навучальнага года. І падчас работы над Кодэксам усе замахі на працягласць школьных канікул былі паспяхова абвергнуты.

Між іншым, у Міністэрстве адукацыі не скідваюць з рахунку і кадравы фактар. На думку міністра адукацыі, у вялікай ступені вынікі работы ўстаноў адукацыі залежаць ад сістэмы падбору, падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў.

І для школьнікаў, і для настаўнікаў навіна пра падаўжэнне навучальнага года прагучала як гром сярод яснага неба.

Расійскі калега Сяргея Маскевіча, міністр адукацыі Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Ліванаў заявіў, што, на яго думку, толькі пяць працэнтаў студэнтаў педагагічных ВНУ ў Расіі бачаць сябе ў будучыні настаўнікамі, ды і ўвогуле, педагагічныя ВНУ са сваёй задачай не спраўляюцца. Таму сёння ў Расіі працуюць над прафстандартам, дзе будзе прадугледжана сістэма прафесійных экзаменаў для выпускнікоў ВНУ. Гэта значыць, што прафесійныя экзамены будуць здаваць у тым ліку і выпускнікі педагагічных факультэтаў, перш чым пайсці працаваць у школы. А як ставяцца да падобнай ініцыятывы ў нас, пацікавіліся мы ў Сяргея Маскевіча:

— Упэўнены, што ў беларускіх ВНУ — не такая крытычная сітуацыя, але, не буду ўтойваць, што мы таксама занепакоеныя ўзроўнем падрыхтоўкі выпускніка педагагічных спецыяльнасцяў, які нярэдка адстае ад тых патрабаванняў, што прад'яўляюцца сучаснай школай. Для таго, каб выпусціць з ВНУ моцнага педагога, у педагагічную ВНУ павінен прыйсці матываваны і добра падрыхтаваны абітурыент, але зараз кіраўнікі ВНУ далёка не заўсёды задаволены якасным складам сваіх студэнтаў.

І хоць Сяргей Маскевіч канстатаваў ажыўленне ў гэтым годзе цікавасці з боку моладзі да педагагічных спецыяльнасцяў у шэрагу ВНУ, аднак ахвотных выкладаць матэматыку і фізіку ў школах, на жаль, больш не стала. Напрыклад, у Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце на спецыяльнасць «Фізіка. Матэматыка» прахадны бал склаў 64, на спецыяльнасць «Прыкладная матэматыка» (навукова-педагагічная дзейнасць) — 86... А ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце конкурсу на спецыяльнасцях «Матэматыка. Інфарматыка», «Фізіка. Інфарматыка» і «Фізіка. Тэхнічная творчасць» і ўвогуле не было...

Надзея НІКАЛАЕВА

■ У чаканні перамен

Васіль БУДКЕВІЧ:

«ЭКСПЕРЫМЕНТ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕ ПАГОРШЫЦЬ СТАНОВІШЧА ПЕДАГОГАЎ»

З 1 студзеня 2013 года ў Беларусі будзе запушчаны пілотны праект па ўкараненні новага механізму фінансавання адукацыйнай галіны. Пра тое, што чакаюць ад яго рэалізацыі ў галоўным адукацыйным ведамстве краіны і ці варта хвалявацца за заўтрашні дзень педагогам і вучням сельскіх школ, расказаў журналістам на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры намеснік міністра адукацыі Васіль БУДКЕВІЧ.

— Справа ў тым, што педагогі і фінансісты жывуць, у пэўным сэнсе, у розных вымярэннях: у сістэме адукацыі новы навучальны год распачынаецца 1 верасня, а фінансавы год стартуе 1 студзеня. Натуральна, што ў сярэдзіне навучальнага года вучні не будуць шукаць сабе новую школу, але за паўгода мы спадзяёмся неяк «раскруціць» гэты праект, менавіта таму мы не ўтойваем, якія ўстановы адукацыі будуць у ім задзейнічаны, бо за першым студзеня прыйдзе і першае верасня... І да гэтага часу і вучні, і педагогі павінны будуць вызначыцца са сваім выбарам. ...

Галоўная ідэя новага механізму фінансавання заключаецца ў стварэнні канкурэнтнага асяроддзя на рынку адукацыйных паслуг і стымуляванні цікавасці з боку педагогаў да вынікаў сваёй прафесійнай дзейнасці. Фінансаванне ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе ажыццяўляцца на падставе нарматыву бюджэтнай забяспечанасці на аднаго навучэнца. Грошы будуць ісці следам за вучнем, прымушаючы педагогаў змагацца за кожнае дзіця. Але чым можна вучня сёння зацікавіць? Напэўна, не толькі суперсучаснай «начынкай» школы, але і зместам педагагічнай работы, якасцю адукацыйных паслуг. З іншага боку, узрастае і роля педагога...

Апрабацыю механізму плануецца ажыццявіць на базе асобных агульнаадукацыйных устаноў Мінска, Гомеля і Гродна. Кіраўнікам гэтых устаноў будзе прадастаўлена права самастойна распараджацца сэканомленымі бюджэтнымі сродкамі і накіроўваць іх на фінансаванне іншых выдаткаў, у тым ліку і на стымулюючыя выплаты. У рамках пілотнага праекта ва ўстановах, што задзейнічаны ў эксперыменце, плануецца стварыць фонд стымулявання працы ў памеры 30% ад планавага фонду заработнай платы, аб'яднаўшы бюджэтныя сродкі, прадугледжаныя на прэміраванне (гэта 20%) і ўстанаўленне надбавак стымулюючага характару (10%). Акрамя таго на стымуляванне працы могуць накіроўвацца таксама сродкі, што былі сэканомлены ў выніку аптымізацыі штатнай колькасці работнікаў установы адукацыі. Стымуляванне работнікаў будзе ажыццяўляцца на падставе крытэрыяў ацэнкі дзейнасці педагагічных работнікаў установы агульнай сярэдняй адукацыі.

БУДЗЬ У КУРСЕ:

У эксперыменце будуць удзельнічаць: СШ №№7, 23, 27 горада Гродна і Гродзенская гарадская гімназія; СШ №№11, 22, гімназіі № 51 і №56 горада Гомеля; мінская СШ №161 і сталічныя гімназіі №№ 10, 12, 61, 146, 192, 2, 11 і 18.

Сельскія школы задзейнічаць у эксперыменце не плануецца. Больш за тое, у дачыненні да сельскіх школ, магчыма, увогуле нарматыў прымяняцца не будзе.

— Мы цудоўна разумеем, што перад вучнямі сельскіх школ такія шырокія магчымасці ў выбары месца навучання, як перад гараджанамі, не адкрываюцца, таму эксперымент пакуль стартуе толькі ў буйных гарадах. Фінансаванне сельскіх устаноў адукацыі будзе ажыццяўляцца з улікам фактычных выдаткаў і не будзе залежаць ад колькасці навучэнцаў, — патлумачыў Васіль Будкевіч.

Натуральна, усіх хвалюе, наколькі хутка будзе ўкараняцца новы механізм фінансавання?

— Міністэрствам адукацыі сумесна з аблвыканкамамі, Мінгарвыканкамам і педагагічнай грамадскасцю будзе ажыццёўлены комплексны аналіз вынікаў апрабацыі пілотнага праекта, і на яго падставе будзе зроблена ацэнка мэтазгоднасці распаўсюджвання новага механізму фінансавання на ўсе ўстановы адукацыі. Размова не ідзе пра нейкую рэвалюцыю, — заспакоіў Васіль Будкевіч. — На другі этап эксперыменту мы плануем выйсці толькі ў 2015 годзе.

Васіль Будкевіч паведаміў, што пры вывучэнні магчымага пераходу на іншую мадэль аплаты працы педагогаў вывучаўся ў тым ліку і досвед расійскіх калег. Трэба адзначыць, што там набыццё школамі фінансавай самастойнасці вылілася ў шэраг негатыўных момантаў, звязаных з прамым прымяненнем да сістэмы адукацыі законаў рынкавай эканомікі. У прыватнасці, актывізавалася закрыццё малакамплектных школ, адбылося скарачэнне работнікаў галіны, перш за ўсё наменшаму кіраўнікоў устаноў, настаўнікаў хіміі, фізікі, выхавальнікаў груп падоўжанага дня, псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, вучэбна-дапаможнага і абслуговага персаналу. У многіх расійскіх рэгіёнах увогуле адмовіліся ад груп падоўжанага дня.

— Мы разумеем, што нельга слепа капіраваць чужы досвед. Спадзяёмся, што нам удалося ўлічыць усе праблемы і рызыкі, з якімі давялося сутыкнуцца нашым расійскім калегам. Але эксперымент ёсць эксперымент. Ніхто не ведае, што нас чакае ў наступны момант. Адно магу сказаць з упэўненасцю: фінансаванне ўстаноў адукацыі, што задзейнічаны ў эксперыменце, дакладна не пагоршыцца, і эксперымент ні ў якім разе не пагоршыць становішча педагогаў, — дадаў Васіль Будкевіч.

БУДЗЬ У КУРСЕ:

У зацверджаны нарматыў бюджэтнай забяспечанасці на аднаго навучэнца не будуць уваходзіць выдаткі на капітальны, бягучы рамонт, на набыццё абсталявання, камунальныя выдаткі і выдаткі на харчаванне навучэнцаў. Асноўную ж частку нарматыву (ад 90 да 96%) будуць складаць выдаткі на заработную плату.

Надзея НІКАЛАЕВА

ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ МАЛОМУ БІЗНЭСУ?

Аб значэнні малога бізнэсу, аб праблемах, якія існуюць з яго развіццём, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з кандыдатам эканамічных навук, дацэнтам, загадчыкам кафедры «Асновы бізнэсу» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Аляксандрам Івашуціным.

— Зразумела, што для эканомікі вялікае значэнне маюць буйныя прадпрыемствы. Але ж без праслойкі малога бізнэсу таксама будзе цяжка...

— Так, сапраўды. Давайце паглядзім, адкуль малы бізнэс з'явіўся. Уявім сабе, што ў нас ёсць некалькі гарадаўтваральных прадпрыемстваў. Узнікае пытанне: хто будзе пячы пірагі, вазіць людзей, займацца забаўляльнай сферай і гэтак далей? Таму ў любой краіне малы бізнэс адыгрывае значную ролю. Вядома, з пункту гледжання аб'ёмаў малы бізнэс пакуль што ў нас займае не вельмі вялікую «плошчу» ў ВУП. Паводле статыстыкі, доля малых прадпрыемстваў у ВУП складае каля 16% (у 2011 годзе было 15,7%). А малыя прадпрыемствы — гэта прадпрыемствы да 100 чалавек. У расіян гэтая доля прыкладна на 3-5% большая: таксама не вельмі істотна. А вось у амерыканцаў лічба даходзіць да 50%. Праўда, у іх статыстыка трошкі іншая: пад малым бізнэсам маецца на ўвазе прадпрыемства да 500 чалавек. Наш малы бізнэс, вядома, развіваецца, але ёсць яшчэ маса праблем. У нас зараз каля 88 тысяч малых прадпрыемстваў. Штогод гэтая лічба на 7-8% павялічваецца. Аднак з 88 тысяч рэальна працуюць толькі каля 77 тысяч. А значыць, каля 10-15% прадпрыемстваў зарэгістраваны, але не правялі ніводнай аперацыі. Іх рэгіструюць «на ўсялякі выпадак». Фірмы-аднадзёнкі таксама існуюць. Хтосьці мог збірацца адкрыць бізнэс, але сродкаў не хапіла. Фінансавыя выдаткі пры рэгістрацыі нязначныя. А калі нічога не зрабіў, то і плаціць нікому нічога не трэба.

— Няўжо цяжкасці толькі ў гэтым?

— Вялікая колькасць стратных прадпрыемстваў у асяроддзі малога бізнэсу. Парадокс такі: рэнтабельнасць прадукцыі прадпрыемстваў малога бізнэсу ў сярэднім — прыкладна 13% (і гэта добрая рэнтабельнасць; з іншага боку, колькасць стратных прадпрыемстваў таксама значная (каля 20%). Узнікае пытанне: як пры такой высокай рэнтабельнасці столькі стратных? Аказваецца, што любыя негатыўныя фактары прыводзяць да таго, што прадпрыемства становіцца банкрутам. З іншага боку, любая маленькая прыгожая ідэя прыносіць добры прыбытак. Таму арганізацыя такіх прадпрыемстваў патрабуе вялікай асцярожнасці.

— Чаму такое, як вы кажаце, няўстойлівае асяроддзе? Што не дазваляе нармальна развівацца?

— Уявіце сабе буйное транспартнае прадпрыемства. У вас 100 аўтамабіляў. Попыт на вашы паслугі скараціўся, напрыклад, на 10%. Для вас гэта азначае, што 10 аўтамабіляў ужо не будуць задзейнічаны. І ўсё. Павялічацца аб'ёмы на 10% — прыкупіце яшчэ 10 аўтамабіляў. А калі ў вас малы бізнэс? У вас два аўтамабілі? Узнікае праблема павелічэння попыту — два аўто не спраўляюцца. А трэці купіць — страшна: вялікія выдаткі. Тым больш што ёсць рызыка змяншэння попыту. Што тады рабіць з трэцяй машынай? Тут і ўзнікаюць сітуацыі, якія прадпрыемствы перажыць не могуць. Аднак апошнім часам тое-сёе робіцца, каб такога пазбегнуць. Маю на ўвазе дапамогу малому бізнэсу. Я праводзіў маніторынг у 2010 годзе пасля вядомага 148-га Закона (Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года №148-З «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва». — **Аўт.**), які прадугледжваў даволі значныя змяненні. А вось, напрыклад, летась практычна нічога не было зроблена. Адзінае, што падатковая сістэма стала трошкі прасцей.

— Хіба нейкай канкрэтнай дапамогі прадпрымальнікам у нас не існуе?

— Не, яна існуе. Гэта тры кірункі: цэнтры падтрымкі прадпрымальнікаў, бізнэс-інкубатары і Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў. Цэнтраў падтрымкі ў нас 81. У асноўным гэта прыватныя прадпрыемствы. Гэта маленькія прадпрыемствы кансалтынгавага тыпу: да іх можна звярнуцца, атрымаць кансультацыю. Гэтыя цэнтры маюць некаторую падтрымку з боку дзяржавы. І 81 цэнтр — гэта мала. За мінулы год туды звярнулася каля 80 тысяч чалавек. А ў нас толькі малых прадпрыемстваў каля 88 тысяч. Акрамя іх яшчэ каля 230 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў. Сітуацыя з інкубатарамі яшчэ горшая. Іх, па-мойму, зараз 16. Сэнс іх у тым, што вось ёсць у мяне нейкі бізнэс, памяшканне, частку якога я магу вам здаць разам з офіснай тэхнікай, і да таго падобнае. І ўсе інкубатары ў асноўным пры буйных прадпрыемствах. Тым больш што там можна заставацца толькі два-тры гады. Што датычна фонду фінансавай падтрымкі, то ён выдзяляе прадпрымальнікам зусім мізэрныя грошы. Ды і атрымаць гэтыя грошы не так лёгка: шмат папяровай працы. Фонд праз пэўныя сістэмы можа льготаваць крэдыты ў банках. У палажэнні аб гэтым фондзе напісана, што крэдыт малы бізнэс можа атрымаць па стаўцы Нацыянальнага банка. Дэльта, якую закладваюць камерцыйныя банкі, даплачваецца з бюджэту.

— Якім чынам тады можна палепшыць сітуацыю?

— Я лічу, што трэба з чыноўнікамі неяк разбірацца. Кожны на сваім месцы баіцца прымаць нейкія рашэнні. І гэтая бюракратычная машына шмат што тармозіць. А таксама падатковую сістэму было б карысна яшчэ больш спрасціць.

— А для чаго такая складаная падатковая сістэма? Няўжо нельга прасцей?

— Усе гэтыя хітрыкі чыноўнікаў накіраваны на тое, каб бізнэс не падманваў. Што б мы ні казалі, бізнэс і ўвогуле ўсе людзі так створаны, што імкнуцца як мага менш заплаціць. Нават у амерыканскім падатковым заканадаўстве дастаткова розных выкрутасаў. Там у кожным штаце свае законы. І можа працаваць прадпрыемства ў адным штаце, а быць зарэгістравана ў другім, бо там меншы падатак. І там чыноўнікі таксама імкнуцца такіх бізнэсменаў «прыціснуць» і прыдумляюць розныя схемы. Але ў нас барацьба з гэтым «патэнцыйным падманам» часцей толькі ўскладняе жыццё.

— Значыць, праблема нават не толькі ў грашах..?

— Так. Аднак пры апытанні сярод кіраўнікоў малых і сярэдніх прадпрыемстваў на першае месца, як ні дзіўна, выйшла праблема падбору кадраў. Таму з гэтым таксама трэба штосьці рабіць. Мы неяк спрабавалі арганізаваць у сябе цэнтр падтрымкі прадпрымальнікаў. У нас жа на факультэце ёсць і маркетолагі, і эканамісты — мы маглі ўсё гэтыя пытанні закрываць. Аднак ідэя не знайшла водгуку. Хоць зараз ёсць дзяржаўная праграма падтрымкі прадпрымальнікаў на 2010-2012 гады. І там па раздзелах напісана, што дзяржава павінна зрабіць. Аднак слоў шмат, а спраў — не надта. Як і іншыя ўніверсітэты, мы маем факультэты перападрыхтоўкі кадраў і спрабуем вырашаць кадравае пытанне такім чынам. Прыходзяць вучыцца і менеджары, і кіраўнікі, і беспрацоўныя. Спадзяюся, што калі-небудзь кіраўнікі прадпрыемстваў не будуць ставіць на першае месца кадравую праблему.

— Чым у нашай краіне часцей за ўсё займаецца малы бізнэс?

— У нас у малым бізнэсе на першым месцы і па колькасці, і па выручцы — гандлёвыя прадпрыемствы. І вельмі мала вытворчых. Гэта дрэнна. У многіх краінах існуюць малыя прадпрыемствы, якія працуюць пры буйных. Нічога страшнага ў гэтым няма. Тым больш што летась ішла размова, што варта актыўней развіваць такія прадпрыемствы. І мы таксама на гэта зрэагавалі: адкрылі новы кірунак. Раней было тры — стварэнне новага прадпрыемства з нуля, рэарганізацыя малога прадпрыемства, распрацоўка буйных праектаў у межах існуючых прадпрыемстваў. І вось з мінулага года ўжо было зроблена некалькі праектаў стварэння малога прадпрыемства пры буйным. І ў Беларусі, вядома, такія прадпрыемствы існуюць. Аднак хто на іх працуе? Сват, брат (і гэтак далей) тых, хто кіруе буйнымі прадпрыемствамі. Інакш арганізаваць гэта ўсё вельмі складана. Аднак такое было, напэўна, заўсёды. І зрабіць з гэтым штосьці, відаць, немагчыма.

— Ці ёсць супрацьстаянне паміж нашымі і расійскімі бізнэсменамі ў Беларусі?

— Насамрэч такое ёсць. У расіян грошай больш — ім прасцей. І беларусам з імі вельмі складана канкураваць.

— Мы з вамі ўсё больш размаўляем пра сітуацыю ў горадзе. А, напрыклад, малыя гаспадаркі ў сельскай мясцовасці таксама патрэбныя...

— Я згодны з вамі. Але там таксама ёсць свае падводныя камяні. Ёсць прэцэдэнты, калі прыходзіць прыватнік на непатрэбную мясцовым зямлю, апрацоўвае яе, а пасля гэтую зямлю ў яго забіраюць назад — «Цяпер мы і самі зможам». Цяжка ў сельскую гаспадарку прыцягваць кагосьці, бо зямлю не хочуць прадаваць — толькі ў арэнду. А пры такіх умовах прадпрымальнік сябе няўпэўнена адчувае. Ды і зноў жа праблема з тэхнікай: напрыклад, дазволіць сабе асабісты камбайн можа толькі вялікая гаспадарка. Аднак развіваць гэта ўсё патрэбна. Думаю, з часам усё само павінна разварушыцца.

— Ці падаюць вам студэнты нейкія новыя ідэі? Прапаноўваюць нестандартныя падыходы?

— Вядома, большасць студэнтаў — максімалісты, якім мора па калена. Яны думаюць, што зараз возьмуць і ўсё зробяць. Мы іх стымулюем на тое, каб не толькі добра вучыліся, але і практыкаваліся, працавалі. Але часцей за ўсё яны ўсё роўна ідуць у гандлёвыя прадпрыемствы, хоць мы ім і прапануем паспрабаваць сябе ў вытворчым бізнэсе (усё ж такі ВНУ тэхнічная). А прапаноўваюць яны, вядома, фантазіі ў асноўным. Хоць я і сам з адной фантазіяй ужо які год бегаю. Некалькі гадоў таму я быў у Галандыі і бачыў, як у такім жа ўніверсітэце ў межах факультэта створана некалькі малых прадпрыемстваў. Там іх называюць «машына для навучання». Яны там займаюцца нейкай нязначнай вытворчасцю ці сэрвісам. Статутны фонд складаецца з бацькоўскіх укладанняў. І там усё па-сапраўднаму: дырэктар, бухгалтар і гэтак далей. Яны плацяць падаткі. Я кажу: «Давайце мы такую створым». А мне кажуць, што пасля будуць праблемы, бо падумаюць, што я тут грошы адмываю...

Гутарыў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

г. ВИТЕБСК 03.10.2012

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ
НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ СНИЖЕНА НА 20%

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи объекта аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Капитальное строение, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Адамовский с/с, вблизи дер. Струбки	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 250/С-34878 (высоковольтный кабель «ААБ-3х95»).	204 296 995	20 429 690

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

Аукцион состоится 03.10.2012 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 02.10.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 03.10.2012 с 14.00 до 15.00.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет **№ 3642903027026** в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. **Участник, ставший победителем аукциона (претендент на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, не позднее семи рабочих дней со дня проведения аукциона подписать договор купли-продажи объекта.

4. Информация об аукционе, условиях продажи, участия в торгах опубликована ранее в газете «Звязда» № 80 (27195) от 26.04.2012.

Общество с дополнительной ответственностью «Нэкст Трейдинг Компани»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

№ лота	Наименование имущества	Место нахождения имущества	Собственник	Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС)	Задаток 5%, рублей (без учета НДС)
ИМУЩЕСТВА (без учета НДС)					
1	**Здания одноквартирного кирпичного жилого дома общей площадью 422,0 м², инв. № 350/С-6002, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. 11 июля, д. 3, на зем. участке площадью 0,0395 га**	**г. Гомель, ул. 11 июля, д. 3**	**ОДО «Нэкст Трейдинг Компани»**	**1 329 653 000**	**66 482 650**

Организатор торгов – управляющий в деле о банкротстве ОДО «Нэкст Трейдинг Компани» Будков Д.В.

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется до 01.10.2012 г. (включительно), на р/с № 3012130990006 – текущий в белорусских рублях в ОАО «Банк БелВЭБ», МФО 153001226, УНП 490499237.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 01.10.2012 года** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Дата, время, место проведения открытого аукциона **02.10.2012 года в 12.00,** г. Гомель, ул. Молодости, 5.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 655 33 68; (8029) 621 22 36.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

Организатор аукциона: фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел.: (8017) 228-60-13, 224-39-76, 500-47-10. Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Чкалова, 5. Дата и время проведения аукциона: 28 сентября 2012 г. в 12.00

Лот № 1

Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 631/С-12361) – одноэтажное **здание отделения связи** с пристройкой, общая площадь 48,9 кв.м, 1960 года постройки, фундамент бутовый, стены бревенчатые, перегородки деревянные, чердачное перекрытие деревянное, крыша шиферная. Принадлежности: дощатые сарай (8 кв.м) и уборная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,0712 га по адресу: Минская обл., Вилейский район, дер. Костеневичи, ул. Центральная. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 99 лет. **Условия использования земельного участка:** разрешено использовать земельный участок для размещения объектов административного назначения либо объектов жилой застройки. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо: в двухмесячный срок с момента заключения договора аренды земельного участка обеспечить государственную регистрацию права на земельный участок; при необходимости в течение двух месяцев после заключения договора аренды земельного участка обеспечить в установленном порядке выполнение работ по восстановлению границ земельного участка на местности; приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев – для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, а для граждан – в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка); соблюдать права и обязанности землепользователей, установленные Кодексом Республики Беларусь о земле; осуществлять всякое строительство, реконструкцию строений и сооружений в соответствии с законодательством Республики Беларусь; содержать предоставленный участок и прилегающую к нему территорию в надлежащем санитарном состоянии; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий два года (в случае изменения назначения недвижимого имущества); осуществить строительство (реконструкцию) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией (в случае изменения назначения недвижимого имущества).

Начальная цена предмета аукциона: 31 298 936 рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 20%.* **Размер задатка: 6 000 000 рублей.**

Продавец: республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта» (Минский филиал, г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3, тел.: (8017) 2227585, 2243202, 2132818). **Арендодатель земельного участка:** Вилейский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Вилейка, ул. Партизанская, 40, тел. (801771) 55161).

Лот № 2

Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 623/С-740) – одноэтажное **здание отделения почтовой связи с верандой**, общая площадь 48,4 кв.м, 1948 года постройки, фундамент бутовый, стены бревенчатые, перегородки дощатые, чердачное перекрытие деревянное, крыша шиферная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,0252 га по адресу: Минская обл., Узденский район, дер. Валерьяны, назначение: для обслуживания и эксплуатации строений в дер. Валерьяны. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 99 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов рекреационного назначения, спорта и туризма, административных, общественных и жилых зданий, предприятий по обслуживанию населения и других производств, размещение которых допускается в зоне жилой застройки. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией возникновения прав на земельный участок.

Начальная цена предмета аукциона: 26 402 052 рубля. *Начальная цена продажи объекта понижена на 20%.* **Размер задатка: 5 000 000 рублей.**

Продавец: республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта» (Минский филиал, г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3, тел.: (8017) 2227585, 2243202, 2132818). **Арендодатель земельного участка:** Узденский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Узда, ул. Советская, 22, тел. (801718) 734016).

Лот № 3

Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 632/С-10056) – одноэтажное **здание приводной радиостанции** общей площадью 82,1 кв.м, 1958 года постройки, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша рулонная совмещенная. Принадлежности: кирпичная агрегатная (47 кв.м), дощатые уборная (2 кв.м) и сарай (29 кв.м), деревянный решетчатый на бетонных столбах забор (346,75 м.п), металлические ворота с калиткой, асфальтобетонное покрытие (304 кв.м), водопровод, подземная кабельная линия. Недвижимое имущество расположено на земельном участке площадью 0,7434 га по адресу: Минская обл., Воложинский район, г.п. Ивенец, ул. Дзержинского, д. 51, назначение: земельный участок для обслуживания зданий и сооружений. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов рекреационного назначения, спорта и туризма, административных, общественных и жилых зданий, предприятий по обслуживанию населения и других производств, размещение которых допускается в зоне жилой застройки. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией возникновения прав на земельный участок.

Начальная цена предмета аукциона: 361 324 338 рублей. Размер задатка: 50 000 000 рублей.

Продавец: республиканское унитарное предприятие по аэронавигационному обслуживанию воздушного движения «Белаэронавигация» (г. Минск, ул. Короткевича, 19, комн. 224, тел.: (8017) 2225220, 2225302, 2260692). **Арендодатель земельного участка:** Воложинский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Воложин, пл. Свободы, 2, тел. (801772) 55572).

Задаток для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 26 сентября 2012 г. включительно. Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **26 сентября 2012 г. до 12.00.**

Задаток для участия в аукционе перечисляется на текущий (расчетный) счет № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». **Назначение платежа:** *задаток для участия в аукционе.*

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 310, 312.**

Информация о предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности».

Земельные участки предоставляются победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договоров аренды.

Для участия в аукционе в указанные в извещении сроки необходимо подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан:

1. подписать протокол о результатах аукциона; 2. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка; 3. после совершения названных действий и представления организатору аукциона, продавцу, и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества (на срок не более 1 года со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей) может быть предоставлена по письменному заявлению покупателя при заключении договора купли-продажи по решению продавца по согласованию с соответствующим государственным органом.

В случае приобретения недвижимого имущества для целей организации производства товаров (работ, услуг) собственного производства и (или) их реализации покупателю по его письменному заявлению предоставляется рассрочка оплаты указанного имущества на срок, указанный в таком заявлении, но не более пяти лет со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей и соблюдением иных требований, предусмотренных законодательством о распоряжении государственным имуществом. Условием предоставления рассрочки является принятие покупателем недвижимого имущества обязательства по организации в течение срока, указанного в заявлении о предоставлении такой рассрочки, но не более трех лет со дня заключения договора купли-продажи, производства товаров (работ, услуг) собственного производства и (или) их реализации.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
строительства многоквартирного жилого дома в д. Боровляны Минского района Минской области

Данная проектная декларация отменяет действие проектной декларации строительства многоквартирного жилого дома в д. Боровляны Минского района Минской области, опубликованной 13 июля 2012 г. в газете «Звязда» (№ 133 (27248)).

Информация о застройщике

Общество с ограниченной ответственностью «ЗаславльСтройИнвест» (ООО «ЗаславльСтройИнвест»).

Место нахождения: Минская область, Минский район, д. Новоселье, ул. Школьная, д. 2, каб. 20.

Режим работы: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Государственная регистрация застройщика: ООО «ЗаславльСтройИнвест» зарегистрировано Минским районным исполнительным комитетом 5 октября 2009 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690711881.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, ООО «ЗаславльСтройИнвест» участие не принимало.

Информация о проекте

Цель проекта: строительство многоквартирного жилого дома в д. Боровляны Минского района Минской области.

Срок реализации проекта: 4 квартал 2011 г. – 4 квартал 2012 г.

Государственная экспертиза проектной документации: экспертное заключение № 992–70/11, выданное 13.06.2011 г. Дочерним Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза по Минской области».

Местонахождение строящегося многоквартирного жилого дома: Минская область, Минский район, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы.

Характеристика строящегося многоквартирного жилого дома: 10-этажный 2-секционный 100-квартирный крупнопанельный жилой дом типовой серии М 464–У1 ОАО «МАПИД» с техподпольем и теплым чердаком. Количество квартир в доме – 100, в том числе: однокомнатных – 42 ед., двухкомнатных – 58 ед. Отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется. Системы отопления – горизонтальные двухтрубные, монтируются из полиэтиленовых труб, проложенных в подготовке пола в защитной гофрированной трубе. В качестве нагревательных приборов к установке приняты алюминиевые радиаторы. Горячее водоснабжение централизованное. Подключение объекта предусмотрено к существующим и ранее запроектированным инженерным сетям теплоснабжения, водоснабжения и канализации. Для поквартирного учета устанавливаются счетчики холодной и горячей воды СВХ-15 и СВГ-15. В здании выполняется автоматизированная система контроля учета электроэнергии (АСКУЭ). Проектом предусматривается установка на 1-ом этаже оптического сплиттерного шкафа в полной комплектации. Для телефонизации объекта проектом предусматривается построение пассивной оптической сети (PON). Сеть PON предусматривается выполнить от оптического распределительного шкафа, установленного на первом этаже жилого дома. Телефикация предусматривается путем прокладки кабеля типа QR540 JASS в кабельной канализации от оптического узла, расположенного в жилом доме № 1 по ГП, до модульного магистрального усилителя типа УММ-001Н. Проектом принято охранно-переговорное устройство «ПИРРС-1000». Транспортное обслуживание жилого дома осуществляется со стороны внутриквартального проезда с уширением проезжей части для стоянки на 12 и 13 машино-мест.

Цены на объекты долевого строительства:

однокомнатные квартиры – **7 300 000 рублей** за 1 кв.м общей площади;

двухкомнатные квартиры – **7 300 000 рублей** за 1 кв.м общей площади.

Условия оплаты: уплата цены договора производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. По соглашению сторон, уплата цены объекта долевого строительства может быть произведена дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.

Количество предлагаемых объектов долевого строительства: 15 единиц.

Права застройщика на земельные участки: решение Минского районного исполнительного комитета (Минский райисполком) от 12 августа 2011 г. № 6768 «О предоставлении земельных участков обществу с ограниченной ответственностью «ЗаславльСтройИнвест» для строительства многоквартирного жилого дома и инженерных сетей к нему в д. Боровляны Боровлянского сельсовета Минского района».

Свидетельство (удостоверение) № 600/967 – 4215 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 623680601101002349, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, площадь – 0,3790 га, назначение – Земельный участок для строительства многоквартирного жилого дома, составлено Республиканским унитарным предприятием «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 26 августа 2011 г.

Свидетельство (удостоверение) № 600/967 – 4216 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 623680601101002350, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, площадь – 0,0490 га, назначение – Земельный участок для строительства инженерных сетей к многоквартирному жилому дому, составлено Республиканским унитарным предприятием «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 26 августа 2011 г.

Границы земельного участка: с северо-западной стороны – ул. 40 лет Победы, с юго-востока и юго-запада – внутриквартальный проезд, с северо-запада – жилой дом № 1.

Площадь земельного участка: 0,3790 га.

Элементы благоустройства: проектом предусмотрено благоустройство и озеленение территории, прилегающей к жилому дому, устройство двух автостоянок на 12 и 13 машино-мест, площадки для сбора отходов с установкой контейнеров.

Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме: Техподполье дома предназначено для размещения инженерных сетей. Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую долевую собственность дольщиков.

Предполагаемый срок ввода многоквартирного жилого дома в эксплуатацию: 4 квартал 2012 года.

Договор строительного подряда: договор строительного генподряда № 2 от 19.10.2011 г., заключен Застройщиком с Открытым акционерным обществом «МАПИД».

Условия ознакомления с объектом долевого строительства: ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, д. 7, офис 302 (тел.: 8–017–2–900–901, 8–029–1–907–901) или на сайте **vivainvest.by**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
строительства многоквартирного жилого дома с размещением спортивной площадки в д. Боровляны Минского района Минской области

Данная проектная декларация отменяет действие проектной декларации строительства многоквартирного жилого дома с размещением спортивной площадки в д. Боровляны Минского района Минской области, опубликованной в газете «Республика» 18 апреля 2012 г. (№ 73 (5488)).

Информация о застройщике

Общество с ограниченной ответственностью «ЗаславльСтройИнвест» (ООО «ЗаславльСтройИнвест»).

Место нахождения: Минская область, Минский район, д. Новоселье, ул. Школьная, д. 2, каб. 20.

Режим работы: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Государственная регистрация застройщика: ООО «ЗаславльСтройИнвест» зарегистрировано Минским районным исполнительным комитетом 5 октября 2009 г. в Едином государственном регистре юридических

Зоя ПАДЛІПСКАЯ, галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова»:

«ШАНУЮЧЫ РОДНАЕ СЛОВА — ДБАЕМ ПРА БУДУЧЫНЮ»

Зоя Падліпская — член праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар паэтычных зборнікаў «Палон нябёсаў», «У вэлюме завей», шэрагу публіцыстычных артыкулаў, навуковых матэрыялаў па пытаннях сучаснай беларускай паэзіі.
Працы ў рэдакцыі часопіса «Роднае слова» папярэднічалі шматлікія жыццёвыя дарогі, і ўсе яны былі асвечаны павагай да роднай мовы, настаўніцкай прафесіі, шчырасцю да кожнага, з кім даводзілася супрацоўнічаць.
Пазнаёміўшыся з Зояй Іванаўнай, яшчэ раз пераконваешся, што чалавека, як і дрэва, трымаюць на свеце карані, а яшчэ — любоў да той справы, якой прысвечана жыццё...

— Зоя Іванаўна, калі адбылося ваша знаёмства з часопісам «Роднае слова»?

— Часопіс «Роднае слова» суправаджае мяне па жыцці яшчэ з той пары, калі ў жніўні 1990 года я прыйшла ў школу выкладаць беларускую мову і літаратуру. Хутка я стала адным з аўтараў гэтага выдання (зараз думаецца, што зусім не выпадкова). З таго часу «Роднае слова» для мяне — дарадца і памочнік. Да гэтай пары ў хатняй бібліятэцы захоўваюцца амаль усе экзэмпляры за дваццаць гадоў. Пэўна, так было прадвызначана лёсам, што мне давялося стаць галоўным рэдактарам дарагога майму сэрцу выдання, каб разам з калектывам сапраўдных прафесіяналаў раздзяліць радасць творчай працы, вялікую адказнасць і клопат за далейшы лёс часопіса.

— Ці не ўзнікае жаданне зноў вярнуцца ў школу?

— А я яе ніколі і не пакідала. Мяняецца толькі ўдзел у адукацыйным працэсе: настаўнік, метадыст, навуковы супрацоўнік НІА, прарэктар па вучэбнай рабоце, галоўны інспектар Міністэрства адукацыі, і вось зараз — галоўны рэдактар навуковага і метадычнага выдання. Кожная з гэтых пасад дазваляла мне рознабакова ўдзельнічаць у жыцці школы. Мы, «роднасловаўцы», і зараз частыя госці ў агульнаадукацыйных установах краіны.

— На ваш погляд, чым адметны часопіс «Роднае слова» ў інфармацыйнай прасторы беларускіх СМІ?

— «Роднае слова» як знакавае выданне філалагічнага і культуралагічнага плана вядома не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. У студзені 2013 года нам спаўняецца 25 гадоў. За гэты час выбудавана канцэпцыя часопіса, захаваны і зберагаюцца лепшыя традыцыі, ідзе пастаянная праца над удасканаленнем зместу. Зараз у часопісе вызначана пяць раздзелаў: «Літаратура і час», «Мовы рысы непаўторныя», «Нацыянальная і сусветная культура», «Методыка і вопыт», «Калі закончыўся ўрок».

Сярод нашых аўтараў — вядомыя вучоныя з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Балгарыі, Славакіі, Казахстана і нават Кітая. З намі супрацоўнічаюць лепшыя настаўнікі краіны, якім ёсць чым падзяліцца з калегамі на старонках часопіса. У рэдакцыйным партфелі сотні матэрыялаў, і кожны дзень мы атрымліваем усё новыя рукапісы.

Адметнасць «Роднага слова» яшчэ і ў тым, што гэта адзіны ў краіне беларускамоўны навуковы і метадычны часопіс, які мае чатыры навуковыя спецыяльнасці (філалогія, педагогіка, культуралогія, мастацтвазнаўства) і адносіцца да ліку рэцэнзаваных выданняў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. Яго матэрыялы адрасаваны як настаўнікам, выкладчыкам, студэнтам, так і культуролагам, мастацтвазнаўцам, педагогам, а таксама ўсім тым, хто шануе роднае беларускае слова. Трэба адзначыць, што ў пэўнай ступені часопіс рыхтуе маладую навуковую эліту краіны.

— Як вы лічыце, у чым прынцыповае адрозненне часопіса «Роднае слова» ад часопіса «Беларуская мова і літаратура»?

— Гэтае пытанне можна пачуць даволі часта. На першы погляд, асабліва людзям недасведчаным, можа здавацца, што часопісы дубліруюць адзін аднаго. Аднак гэта не так. Кожны з часопісаў адметны па-свойму.

Разам з галоўным рэдактарам часопіса «Беларуская мова і літаратура», прафесарам Алесем Іванавічам Бельскім мы робім агульную важную справу на карысць нацыянальнай адукацыі. Гэта вялікае дасягненне, у першую чаргу для настаўнікаў роднай мовы, мець два такія неабходныя і разнапланавыя беларускамоўныя прафесійныя выданні. «Беларуская мова і літаратура» — гэта найбагацейшая метадычная скарбонка, якая дапамагае педагогам якасна, на высокім узроўні арганізаваць актыўную пазнавальную дзейнасць на ўроку, абменьвацца вопытам з калегамі, быць своечасова інфармаванымі па важнейшых пытаннях выкладання прадмета.

«Роднае слова» як навуковае і метадычнае выданне скіравана найперш на асвятленне праблем і перспектыў філалагічнай, культуралагічнай, мастацтвазнаўчай і педагагічнай адукацыі ў рэспубліцы і за яе межамі; прапаганду і папулярызацыю практыкі выхавання і навучання школьнай і студэнцкай моладзі, лепшых здабыткаў нацыянальнай і сусветнай літаратуры, культуры, мастацтва.

Таму я цвёрда пераканана, што гэтыя два часопісы, якія ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго і дапамагаюць педагогам павышаць узровень самаадукацыі не толькі метадычна, але і навукова, павінны займаць адно з самых асноўных месцаў на палічках бібліятэк установ адукацыі.

— Якім вы бачыце свайго чытача, так бы мовіць, яго партрэт?

— Сярод нашых чытачоў людзі розныя па ўзросце, сацыяльным статусе і прафесіі. Гэта не адны філолагі (*усміхаецца*.), як можа падацца на першы погляд.

Як нашы паважаныя аўтары, так і чытачы — людзі дасведчаныя, адукаваныя, якія цікавяцца навуковымі і архіўнымі матэрыяламі, шануюць беларускае слова і адносяцца да яго як да найвялікшай каштоўнасці ў жыцці.

І я гавару зараз не толькі пра настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, культуролагаў і мастацтвазнаўцаў. Чытацкая катэгорыя выдання даволі розная. Часопіс чытаюць і выпісваюць студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі банкаў, вайскоўцы, людзі з медыцынскай адукацыяй; сем'і, якія вывучаюць новую рэдакцыю беларускага правапісу менавіта па нашым часопісе; сем'і, якія пачалі займацца даследаваннем уласнага роду...

Гэта нас вельмі радуе. Безумоўна, хацелася б бачыць сярод нашых чытачоў і падпісчыкаў больш настаўнікаў роднай мовы, бо апошнім часам стан ведамаснай падпіскі выклікае пэўную заклапочанасць. Мы праводзім асветніцкую працу сярод студэнтаў, выкладчыкаў, настаўнікаў роднай мовы, бяром удзел у канферэнцыях, семінарах, фестывалях, пасяджэннях «круглых сталоў».

У Год кнігі толькі ў студзені і лютым рэдакцыяй часопіса «Роднае слова» праведзены тэматычныя сустрэчы з кіраўнікамі метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры агульнаадукацыйных устаноў Заводскага, Фрунзенскага, Ленінскага, Маскоўскага, Савецкага, Першамайскага, Кастрычніцкага, Партызанскага і Цэнтральнага раёнаў г. Мінска. Думаецца, сяброў і прыхільнікаў нашага выдання стане больш, а ў часопісе з'явяцца новыя матэрыялы настаўнікаў сталіцы.

— Летась дзякуючы намаганням часопіса «Роднае слова» ў свет выйшаў першы том з серыі кніг пра старажытныя беларускія роды. Распавядзіце крыху падрабязней пра гэты праект.

— Два гады таму мы атрымалі ліцэнзію Міністэрства інфармацыі на выдавецкую дзейнасць. І ўжо ў верасні 2011 г. была падрыхтавана першая кніга з серыі пра старажытныя беларускія роды «Я — сын Ваш: Летапіс беларускай шляхты» аўтара Анатоля Васільевіча Статкевіча-Чабаганава. Першы том «Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба «Касцеша». Карафа-Кобруты герба «Корчак»» выйшаў на 592 старонках. Кніга выклікала цікавасць у чытачоў і крытыкаў і была распаўсюджана ў бібліятэкі розных краін свету: Прэзідэнцкую бібліятэку Рэспублікі Беларусь, Нацыянальную бібліятэку Беларусі, Цэнтральную навуковую бібліятэку імя Я. Коласа НАН Беларусі, абласныя і цэнтральныя раённыя бібліятэкі краіны, Расійскую нацыянальную бібліятэку (г. Санкт-Пецярбург), Расійскую дзяржаўную бібліятэку (г. Масква), Дзяржаўную публічную гістарычную бібліятэку Расіі (г. Масква), Нацыянальныя бібліятэкі Літвы, Польшчы, Чэхіі, Балгарыі, Славеніі, Сербіі, Славакіі, Венгрыі і іншыя.

Кнігі вышэйназванай серыі ілюстраваны шматлікімі копіямі гістарычных дакументаў, фотаздымкамі і іншымі матэрыяламі. У іх прадстаўлена апісанне кожнага роду, гісторыі з жыцця яго прадстаўнікоў і радаводныя роспісы за пяцьсот і больш гадоў. Зараз нашым выдавецтвам практычна завершана праца над чарговым томам А. Статкевіча-Чабаганава «Некрашэвічы герба «Любіч». Татуры герба «Данброва». Сеўрукі герба «Курч». Кернажыцкія герба «Юноша». Маствіловічы герба «Даленга», а таксама выдадзена кніга Міколы Труса «Янка Купала ў Славакіі».

— Чым яшчэ плануе здзіўляць часопіс «Роднае слова» ў 2012 годзе?

— Сёлета часопіс у другі раз стаў лаўрэатам конкурсу «Залатая Літара» ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы навуковай і навукова-папулярнай тэматыкі».

З мая 2012 г. часопіс «Роднае слова» абвешчаны пляцоўкай для развіцця інстытута крытыкі ў краіне. Разам з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь адным з заснавальнікаў часопіса стала грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі». У красавіку ў часопісе адбылася прэм'ера рубрыкі «Беларуская літаратура XXI стагоддзя», якая дапаможа настаўнікам беларускай мовы і літаратуры сістэмна ўбачыць праблематыку сучаснай паэзіі, прозы, драматургіі, пазнаёміцца з новымі імёнамі беларускіх пісьменнікаў.

«Роднае слова» ўпрыгожылі працы беларускіх мастакоў, аб'яднаныя рубрыкай «Архітэктурная спадчына»: на апошняй вокладцы кожнага нумара чытачы змогуць убачыць шэдэўры нацыянальнага дойлідства, увасобленыя ў творах жывапісу і графікі. У раздзеле «Літаратура і час» працягваем знаёміць чытачоў з літаратурнымі партрэтамі класікаў, архіўнымі знаходкамі, новым прачытаннем спадчыны, помнікамі старажытнай літаратуры, яскравымі імёнамі XXI стагоддзя.

З 2012 г. часопіс «Роднае слова» ўключаны ў міжнародны каталог для падпіскі ў Расіі, Польшчы, Літве, Латвіі, ва Украіне, у Казахстане, Германіі, Венгрыі, Балгарыі, Славакіі, ЗША, Канадзе, што будзе толькі на карысць справе пашырэння, папулярызацыі і зберажэння роднай мовы.

Мы прадоўжылі сумесны праект з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. З мэтай падтрымкі адораных навучэнцаў, развіцця іх творчых здольнасцяў і інтэлектуальнага патэнцыялу мы ўжо ў другі раз абвясцілі конкурс навукова-даследчых і творчых прац. Вынікі конкурсу будуць падведзены ў юбілейным нумары «Роднага слова» ў студзені 2013 г.

Пытанні задаваў Ілья ЛАПАТО.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ

ГОРАЦКАЯ «ПЕРАЗАГРУЗКА»

У раённым цэнтры Горкі, дзе рыхтуюцца прымаць рэспубліканскае свята працаўнікоў вёскі, урачыста адкрыліся чыгуначная станцыя «Пагодзіна», стаматалагічная паліклініка і цэнтральная плошча. Цырымоніі адкрыцця прайшлі з удзелам кіраўніка беларускага ўрада і старшыні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы да «Дажынак» Міхаіла Мясніковіча.

На абноўленай чыгуначнай станцыі «Пагодзіна» зроблена комплексная рэканструкцыя будынка і добраўпарадкаванне навакольнай тэрыторыі. Цяпер гэта сучасны прыгожы вакзал, сапраўдная візітоўка беларускага горада. Станцыю зрабілі камфортнай для пасажыраў і чыгуначнікаў.

У суботу там адкрыўся і рух хуткаснага дызель-цягніка па маршруце «Пагодзіна-Орша». Высокая хуткасць, 90 камфортных месцаў, сучасны «клімат-кантроль», эканомія часу.

— Безумоўна, такім цягніком народ будзе шырока карыстацца, — не мае сумненняў намеснік старшыні Горацкага райвыканкама Наталля Карнеева. — Таму што гэта танна і хутка: білет каштуе ўсяго каля 9 тысяч рублёў, а шлях да Оршы з Горак без прыпынкаў — менш за гадзіну.

Такім чынам, у сталіцу Беларусі з Горак, з улікам перасадкі ў Оршы, можна трапіць крыху больш чым за тры гадзіны. Гэтая чыгуначная лінія будзе зручная і для студэнцкай моладзі, якая вучыцца ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

Другі аб'ект — стаматалагічная паліклініка. Яе будынак з'яўляецца помнікам архітэктуры, які цяпер поўнасцю рэстаўраваны. Але самае лепшае ў паліклініцы — не столькі прыгожыя сцены, колькі самае сучаснае абсталяванне, на якім будуць працаваць вопытныя спецыялісты. Паліклініка разлічана на 160 наведванняў у суткі. Цяпер у Горках стане больш шчаслівых усмешак!

Адкрылася ў Горках і абноўленая цэнтральная плошча, дзе месціцца будынак райвыканкама. Яна ўсё яшчэ афіцыйна носіць імя Леніна, хоць савецкаму помніку ў горадзе знайшлі іншае добрае месца. Паводле інфармацыі мясцовых улад, пасля абмеркавання новай назвы плошчы большасць жыхароў Горак аддае перавагу назве «Цэнтральная», таму што плошча сапраўды знаходзіцца ў цэнтры горада.

Ілона ІВАНОВА.

БАРАВІКІ ПРЫМАЮЦЬ ПА 20-50 ТЫСЯЧ ЗА КІЛАГРАМ

Прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі працягваюць актыўную нарыхтоўку яблыкаў. Іх ужо закуплена 62 тысячы тон, або на 40 працэнтаў больш, чым на тую ж дату мінулага года, паведамілі ў Белкаапсаюзе.

Сёння цана за адзін кілаграм яблыкаў так званых таварных гатункаў, якіх ад насельніцтва ўжо нарыхтавана 28 тон, складае 3-5 тысяч рублёў. Ападкі закупляюцца па 300-500 рублёў за кілаграм. Нарыхтаваныя плады таварных гатункаў найперш ідуць у рознічны гандаль для наступнай рэалізацыі, іншая прадукцыя накіроўваецца на перапрацоўчыя прадпрыемствы.

Працягваецца і нарыхтоўка гародніны: сёлета Белкаапсаюз нарыхтаваў яе ад насельніцтва 5,6 тысячы тон, што ў 1,3 раза больш, чым было летась на той жа перыяд. Цана на агуркі вагаецца ад 2,5 тысячы да 4 тысяч рублёў за кілаграм. Акрамя таго, закуплена 4,1 тысячы тон таматаў, якія зараз прымаюць па 3-5 тысяч рублёў за кілаграм. У «актыве» 4,8 тысячы тон капусты (бяруць па 2,5-3 тысячы рублёў), 39 тон часнаку (прымаюць па 15-20 тысяч рублёў). Грыбоў нарыхтавана 58 тон. Да прыкладу, лісічкі прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі набываюць па 15-20 тысяч рублёў за кілаграм, баравікі — ад 20 да 50 тысяч, чырвонагаловікі, абабкі — ад 10 да 15 тысяч рублёў за кілаграм.

ЦЫГАРЭТЫ КРЫХУ «ПРЫБАВЯЦЬ»

З 1 верасня ў краіне павялічваюцца цэны на некаторыя маркі цыгарэт. Рост, у сярэднім, складзе 3-3,5%.

Падаражэе тытунёвая прадукцыя ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» і ААТ «Тытунь-Інвест». Напрыклад, цэны на цыгарэты «Pall Mall», «Monte Carlo» зменяцца з 6 тысяч да 6,2 тысячы рублёў за пачак. Некаторыя іншыя маркі цыгарэт, якія таксама адносяцца да другой цэнавай групы, падаражэюць на 500 рублёў. Змяненне кошту ў краме і шэраг марак тытунёвых вырабаў трэцяй цэнавай групы. Да прыкладу, шэраг відаў цыгарэт «Camel» (новыя цэны будуць вагацца ад 8,5 тысячы да 9,1 тысячы рублёў за пачак), «Winston», «Lucky Strike» (да 8,5 тысячы рублёў за пачак).

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБ'ЯЗДЖАЎ КУРЫЦУ...

У вёсцы Буцілы Лідскага раёна здзейсніў аўтааварыю 18-гадовы юнак, які... аб'язджаў курыцу, паведамляе Гродзенская абласная Дзяржаўтаінспекцыя.

Курыца перабягала дарогу, і, каб не наехаць на яе, кіроўца «Аўдзі» ўзяў улева. Аўтамабіль зламаў драўляную агароджу і ўрэзаўся ў слуп. Напэўна, на сітуацыю паўплывала і нявопытнасць вадзіцеля, які толькі нядаўна атрымаў пасведчанне на права кіравання транспартным сродкам. Сам ён не пацярпеў, а вось яго 13-гадовай сястры спатрэбілася медыцынская дапамога.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ФАКТЫ

■ У цэнтры ўвагі

НЕ МАНАПОЛІЯ, А БАЛАНС

Што хвалюе жыхароў культурнай сталіцы, высвятляў памочнік Прэзідэнта Беларусі па Мінскай вобласці Мікалай Іванчанка

Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, галоўны інспектар па Мінскай вобласці Мікалай Іванчанка пабываў у Нясвіжскім раёне, дзе сустрэўся з калектывамі цэнтральнай раённай бальніцы і завода медпрэпаратаў.

Гэта адно з чатырох буйных прадпрыемстваў Нясвіжчыны, якое выпускае ў асноўным інфузійныя растворы. На заводзе няпростае фінансавае становішча, невялікія заробкі. І прыезд чыноўніка такога рангу пойдзе толькі на карысць завадчанам. Мікалай Іванчанка абмяркуе сітуацыю, што тут склалася, а таксама планы па стварэнні вытворчасці плазмы крыві і мадэрнізацыі завода з міністрам аховы здароўя. Справа ў тым, што ў раёне ёсць яшчэ адно прадпрыемства, якое выпускае аналагічную прадукцыю медыцынскага прызначэння.

— Манапалізаваць гэты кірунак дзейнасці, відаць, будзе няправільна. Галоўнае, каб, па магчымасці, у далейшым у развіцці двух прадпрыемстваў быў вызначаны баланс. Каб тут не захапіліся імкненнем да інвестыцый, забыўшы пра самае галоўнае — людзей, — падкрэсліў Мікалай Іванчанка. — Трэба імкнуцца да таго, каб прадукцыя была канкурэнтаздольнай, экспартаарыентаванай, а сацыяльны аспект ішоў наперадзе камерцыйнага. Таму варта ўсё ўважліва прааналізаваць, ацаніць і не прымаць імгненных рашэнняў.

Мікалай Іванчанка запэўніў, што заводу медпрэпаратаў будзе надавацца ўвага яшчэ і таму, што сёння ў краіне робіцца стаўка на развіццё сельскіх рэгіёнаў, а Нясвіж, акрамя ўсяго, з'яўляецца і культурнай сталіцай Беларусі. І горад павінен адпавядаць гэтаму статусу ва ўсім: у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, медыцыне, сацыяльна-бытавой сферы.

Апошнім часам у Нясвіжы шмат увагі надаецца развіццю рэгіёна, стварэнню належных умоў жыцця, працы, адпачынку насельніцтва.

— Мы імкнёмся развіваць населеныя пункты, дзе пражывае больш за 4 тысячы чалавек (такія, як Сноў, Гарадзея), так бы мовіць, у роўных прапорцыях. І гэтыя пасёлкі не ўступаюць райцэнтру: тут з'явіліся новыя амбулаторыі, басейны, — канстатаваў старшыня Нясвіжскага райвыканкама Іван Крупко.

Шмат змен адбылося і ў самім горадзе. Адкрыты новыя кавярні, стаянкі, гасцініцы, рэканструююцца паркі. Але з цягам часу павінна быць зроблена яшчэ больш. У чацвёртым квартале пачынаецца будаўніцтва раздзільнага дома на 35 месцаў, падрыхтавана дакументацыя па рэканструкцыі і пашырэнні да 600 месцаў старога Дома культуры.

Апошнія два гады ў рэгіёне ўвялі ў эксплуатацыю 31 тысячу квадратных метраў жылля. Сёлета, нягледзячы на тое, што зменшылася крэдытаванне, пры гадавым заданні ў 10 тысяч квадратных метраў ужо пабудавалі 10,5 тысячы, а да канца года будзе ўзведзена 14 тысяч квадратных метраў. У адным з мікрараёнаў адвялі пляцоўку для індывідуальнай забудовы на 340 участкаў. У парадку чаргі тут могуць атрымаць надзелы для будаўніцтва ўсе, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. «Сёлета заканчваем работы па асвятленні вуліц, добраўпарадкаванні дарог. Да канца 2015 года падвядзём прыродны газ. За кошт гэтага блакітнае паліва паступіць і ў бліжэйшыя населеныя пункты», — падзяліўся планамі Іван Крупко.

Пра змены, якія адбываюцца ў горадзе і раёне, добра ведаюць нясвіжане. Але іх хвалюе і добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, будаўніцтва дзіцячых кавярняў і пляцовак. Як зазначыў старшыня райвыканкама, дзве гульнявыя пляцоўкі ўжо зроблены, заканчваецца абсталяванне яшчэ адной. А ў перспектыве на тэрыторыі былой воінскай часці мяркуецца ўзвесці вялікі комплекс, дзе будуць і месцы адпачынку для дзяцей, і аўтастаянкі, і кропкі грамадскага харчавання, і боўлінг, і забаўляльныя аб'екты. Што датычыцца санвузлоў на аўтавакзале, то яны будуць прыведзены ў належны стан (пра будаўніцтва новых гаворка пакуль не ідзе). Плануецца рэканструкцыя старога будынка вакзала — яна ўключае і абсталяванне новых санітарна-гігіенічных месцаў унутры.

Так, пытанні ёсць, але не ўсё адразу магчыма вырашыць. У раёне ўскладаюць надзеі на аддачу ад будаўніцтва новых прадпрыемстваў — з іх з'яўленнем больш сродкаў будзе паступаць у мясцовы бюджэт. А гэта значыць, што з'явяцца новыя магчымасці для развіцця тэрыторыі горада і раёна.

Разам з тым, заўважыў Мікалай Іванчанка, самі жыхары павінны таксама падтрымліваць у належным стане двары, пад'езды, тэрыторыі вакол індывідуальных забудоў. Толькі дзякуючы агульным намаганням улады і насельніцтва горад стане яшчэ больш прыгожым і ўтульным.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

ЭЛЕКТРОННЫЯ ПРАЯЗНЫЯ БУДУЦЬ УКАРАНЁНЫ Ў МІНСКІМ МЕТРО ЎЖО СЁЛЕТА

Пра гэта паведаміў дырэктар ГУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый Шкуратаў.

Ён нагадаў, што сёння ў горадзе рэалізуецца праграма па аптымізацыі сістэмы аплаты праезду ў грамадскім транспарце і ўкараненні электронных праязных, першы этап якой і будзе рэалізаваны ў метрапалітэне.

Пасажыр зможа набыць праязны квіток на некалькі паездак — 10, 15, 20 і гэтак далей. Адмысловыя прылады будуць рэгістраваць пасажыраў, якія ўваходзяць, і спісваць з электроннага праязнога грашовы рэсурс. На кожнай станцыі будуць стаяць касы папаўнення рахунку. Кожны пасажыр зможа сам у аўтаматычным рэжыме папоўніць свой праязны квіток. Гэтыя ж апараты будуць паказваць, колькі грошай засталося на картцы для аплаты праезду.

У 2013 годзе сістэму электронных праязных плануецца ўкараніць і на наземным пасажырскім транспарце.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, *«Мінск—Навіны»*.

■ Акцэнты

БІТВА ЗА АСАНЖА

Лёс заснавальніка WikiLeaks грамадзяніна Аўстраліі Джуліяна Асанжа служыць бліскучай ілюстрацыяй ідэалагічнай бітвы, якая вядзецца на глабальных прасторах. Ці можа адзін адважны чалавек беспакарана кінуць выклік самай магутнай краіне свету — ЗША і іх саюзнікам, апублікаваўшы ў інтэрнэце іх таямніцы? У краін Захаду рэакцыя адназначная: гэта недапушчальна, Асанж павінен панесці суровае пакаранне.

Развіццё падзей вакол фігуры Асанжа прывяло да міжнароднага супрацьстаяння Паўднёвай Амерыкі і Вялікабрытаніі. Нагадаем, што брытанскі ўрад вырашыў выдаць Асанжа ў Швецыю, дзе супраць яго заведзена крымінальная справа аб згвалтаванні. Сам Асанж і многія яго прыхільнікі называюць гэту справу помстай ЗША за распаўсюджванне праз WikiLeaks неафіцыйнай інфармацыі аб дзейнасці амерыканскіх ваенных і дыпламатаў, якія добра падсапсавалі імідж амерыканцаў у свеце. Не сакрэт, што ЗША хацелі б паквітацца з Асанжам, а Швецыя можа аказаць амерыканцам садзейнічанне ў гэтым. Ратуючыся ад такой перспектывы, Асанж схаваўся на тэрыторыі пасольства Эквадора ў Лондане. І вось тут Вялікабрытанія ўсхадзілася, прадэманстраваўшы, што страта Брытанскай імперыі не пазбавіла Лондан імперскіх замашак. У адрас Эквадора пачуліся пагрозы аб магчымасці пазбаўлення яго пасольства дыпламатычнага статусу, што знаходзіцца ў відавочнай супярэчнасці з нормамі міжнароднай дыпламатыі, замацаванымі Венскай канвенцыяй. А калі Эквадор афіцыйна даў Асанжу палітычнае прыстанішча, улады Вялікабрытаніі заявілі, што Асанж не зможа выехаць з краіны ў Эквадор. Саюз паўднёваамерыканскіх нацый 19 жніўня падтрымаў рашэнне Эквадора аб прадастаўленні прыстанішча Асанжу і заклікаў да адмовы ад пагроз. Рэпутацыя Вялікабрытаніі ў Паўднёвай Амерыцы і так надзвычай сапсаваная з-за Фалклендскіх астравоў, захопленых брытанцамі, якія паўднёваамерыканскія нацыі лічаць прыналежнымі да Аргенціны. Напышлівае стаўленне Лондана да суверэннага права Эквадора даваць палітычнае прыстанішча або валодаць суверэнітэтам на тэрыторыі свайго ўласнага пасольства яшчэ больш разлавала ганарлівых паўднёваамерыканцаў. Вельмі негатыўна паставіўся да нападак на суверэнныя правы Эквадора і харызматычны венесуэльскі лідар Уга Чавес, які перасцярог Вялікабрытанію ад пагражальных ёй непрыемнасцяў пры захаванні такога падыходу.

Не ўтрымалася ад асуджэння заяў брытанскага боку і расійскае МЗС, якое нагадала, што Вялікабрытанія адмаўляецца выдаваць дзясяткі сапраўдных злачынцаў, у тым ліку тых, супраць якіх на радзіме заведзены справы аб цяжкіх злачынствах.

З афіцыйным Лонданам у Расіі свае рахункі. Акрамя надзейнага ўкрыцця ад расійскага правасуддзя злачынцаў, Вялікабрытанія заўсёды актыўна ўмешваецца ва ўнутраныя справы Расійскай Федэрацыі. У 1990-х гадах Лондан быў у першых шэрагах заходніх дзяржаў па падтрымцы ідэі аб аддзяленні Чачні ад Расіі, але пры гэтым нічога не хацеў чуць аб тым, што брытанская Паўночная Ірландыя неяк ненатуральна выглядае на карце астраўной суверэннай ірландскай дзяржавы. А чаго вартая справа з закрыццём у Расіі шматлікіх аддзяленняў Брытанскага Савета, якія адкрываліся на тэрыторыі краіны нелегальна, не плацілі падаткаў і з'яўляліся базай для ўсіх незадаволеных расійскай уладай і, паводле меркавання расійскіх спецслужбаў, брытанскай разведкі. Пасля рашэння Масквы іх закрыць Лондан разгарнуў агульнасусветную кампанію супраць Расіі, вінавацячы яе ў барацьбе са спробай садзейнічання гуманітарнаму прагрэсу пры дапамозе аддзяленняў Брытанскага Савета. Пазіцыя Лондана таксама ўваходзіла ў супярэчнасць з суверэнным правам Расійскай Федэрацыі адкрываць і закрываць на сваёй тэрыторыі любыя падраздзяленні гуманітарных замежных арганізацый, што сведчыла аб уяўленні брытанскага боку: Расія не павінна валодаць поўным суверэнітэтам на сваёй уласнай тэрыторыі.

ЗША і Вялікабрытанія аказаліся ў няпростай сітуацыі. Паляванне на Асанжа дарога абыходзіцца для старанна ствараемага іміджу галоўных абаронцаў правоў чалавека і дэмакратыі ва ўсім свеце. Вядома, гэты імідж значна пацьмянеў пасля апублікаваных Асанжам фактаў забойства мірных жыхароў і рэпарцёраў ваеннымі НАТА ў Афганістане і дзейнасці пасольстваў заходніх краін па стварэнні сеткі тайных інфарматараў і агентаў па ўсім свеце. Паляванне на Асанжа даводзіцца весці ў няпростай сітуацыі, калі нават заходнія СМІ адмаўляюцца верыць у яго вінаватасць. Кожны рэдактар або журналіст у заходніх газетах або на тэлебачанні лёгка можа ўявіць сябе на месцы Асанжа — апынуцца ў ролі абвінавачанага па крымінальнай справе ў адказ на апублікаванне фактаў аб заходнім свеце, якія не варта было выкрываць. І ім гэта, вядома, не можа спадабацца. Грамадская думка, у тым ліку ў саміх заходніх краінах, таксама знаходзіцца на баку Асанжа. Людзі лічаць, што з самага пачатку павінны былі ведаць пра ўсе непрывабныя факты дзейнасці сваіх урадаў, пра якія даведаліся толькі дзякуючы дзейнасці Асанжа, і лічаць, што ў будучыні ўрады будуць паводзіць сябе больш стрымана, улічваючы магчымасць новага выкрыцця.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук

РЭТРА-ПАЦАЛУНАК

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ШКОЛА ІМЯ НАСТАЎНІКА

Бялыніцкай школе № 1 прысвоена імя Мікалая Пашкоўскага, які выкладаў тут фізіку і быў яе дырэктарам, а потым узначаліў раённы аддзел адукацыі.

— Ужо год, як Мікалая Іванавіча не стала, — расказала дырэктар школы № 1 Бялынічаў Таццяна Балдышэўская. — Але ўсе мы памятаем, як ён быў адданы сваёй працы і вёў усіх за сабой, да поспехаў. Самае галоўнае, што яго, настаўніка, вельмі любілі дзеці. Ён быў сур'ёзным і патрабавальным, але, разам з тым, добрым і справядлівым чалавекам. Заўсёды вучыў нас успрымаць вучняў і іх бацькоў на роўных, знаходзіць паразуменне.

У гонар падзеі ў школе адкрыўся пераабсталяваны клас фізікі, у якім выкладаў Мікалай Пашкоўскі.

Ілона ІВАНОВА.

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

Гомельскае абласное ўпраўленне ААТ «ААБ Беларусбанк»:

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД ДА КЛІЕНТА, ДАВЕР І АДКРЫТАСЦЬ

КРЭДЫТАВАННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА

Захаваць лідарства

— Палітыка банка ў частцы крэдытавання фізічных асоб, — гаворыць намеснік начальніка філіяла № 300 — ГАУ ААТ «ААБ Беларусбанк» Аляксандр АРХІПЕНКА, — накіравана на захаванне вядучай пазіцыі Гомельскага ўпраўлення банка на рынку крэдытных паслуг сярод камерцыйных банкаў вобласці, далейшае развіццё сістэмы комплекснага абслугоўвання насельніцтва.

Доля фінансавай установы рэгіёна ў прыцягненні грашовых сродкаў фізічных асоб складае 46%. У частцы крэдытавання грамадзян палітыка банка накіравана на развіццё сістэмы комплекснага абслугоўвання насельніцтва і захаванне вядучай пазіцыі на рынку крэдытных паслуг. Удзельная вага крэдытаў, выдадзеных установамі банка, у аб'ёме крэдытаў, якія прадстаўлены банкамі вобласці, складае 80%. Актыўна ўдзельнічаючы ў рэалізацыі дзяржаўных праграм і аказваючы крэдытную падтрымку прадпрыемствам вобласці, банк утрымлівае высокую долю ў крэдытах юрыдычных асоб — 32%.

Банкам па-ранейшаму захоўваюцца лідзіруючыя пазіцыі на рынку крэдытавання фізічных асоб: крэдытны партфель дасягнуў 3,5 трлн бел. руб. За кошт крэдытнай падтрымкі фінансавай установы за пяць гадоў па Гомельскай вобласці палепшылі свае жыллёвыя ўмовы больш як 24 тысячы сем'яў, а таксама з'явіліся новыя мікрараёны.

На працягу многіх гадоў банк бярэ актыўны ўдзел у рэалізацыі ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваных на аказанне падтрымкі студэнтам, выпускнікам ВНУ, маладым спецыялістам праз выдачу льготных крэдытаў на аплату навучання ў вышэйшых навучальных установах дзяржаўнай уласнасці, набыццё хатняй маёмасці і тавараў першай неабходнасці.

Акрамя ўдзелу ў выкананні дзяржаўных праграм, сёння ў банку можна атрымаць любы крэдыт, які задавальняе патрэбы насельніцтва як у таварах, так і ў разнастайных паслугах. Прапанаваныя віды крэдытаў арыентаваны не толькі на заможных грамадзян, але і на сацыяльна менш абароненыя катэгорыі насельніцтва: шматдзетныя сем'і могуць атрымаць крэдыт на будаўніцтва, набыццё і рэканструкцыю жылля пад 20% гадавых. Тыя, хто пастаянна пражывае і працуе ў сельскіх населеных пунктах, можа разлічваць на больш нізкія працэнтныя стаўкі. Крэдыты на аплату першай адукацыі ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах выдзяляюцца пад стаўку рэфінансавання НБ РБ. На такіх жа ўмовах даюцца крэдыты на набыццё спартыўных хатніх трэнажораў, дзіцячых спартыўных комплексаў, спартыўнага інвентару і экіпіроўкі, а таксама для аплаты адпачынку ў сельскіх аб'ектах аграэкатурызму.

Атрымаць крэдыты на будаўніцтва, рэканструкцыю і набыццё жылля могуць не толькі грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, але і тыя, хто ў гэтым не мае патрэбы, аднак на іншых умовах.

У перспектыве атрымаюць развіццё і будуць рэалізаваны новыя кірункі ў крэдытаванні насельніцтва, якія павысяць якасць нашых паслуг.

Тацціяна МІХАЙЛОЎСКАЯ, начальнік філіяла № 300 — Гомельскага абласнога ўпраўлення ААТ «ААБ Беларусбанк»:

«НАША ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА — ЗАХАВАЦЬ І ЎМАЦАВАЦЬ ПАЗІЦЫІ БАНКА Ў РЭГІЁНЕ»

Горад Гомель па праве лічыцца калыскай банкаўскай сістэмы Беларусі. Праведзеныя даследаванні архіўных матэрыялаў, вывучэнне калекцый фінансавых дакументаў і каштоўных папер дазволілі атрымаць неабвержныя дакументальныя сведчанні таго, што першая банкаўская ўстанова на тэрыторыі сучаснай Беларусі з'явілася менавіта тут, на берагах Сожа. 8 студзеня 1870 года быў падпісаны ўказ Сената Расійскай імперыі аб заснаванні ў Гомелі гарадскога грамадскага банка. З гэтага часу і бярэ свой пачатак гісторыя станаўлення і развіцця банкаўскай сістэмы Беларусі. Зразумела, што і наяўнасць прадстаўніцтва галоўнай банкаўскай установы краіны — ААТ «ААБ «Беларусбанк» — прама ці ўскосна звязана з названымі гістарычнымі падзеямі.

Чаму ж менавіта невялікі Гомель, а не буйны губернскі цэнтр стаў першым беларускім горадам, які меў банк? З гэтым пытаннем і многімі іншымі карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да начальніка філіяла № 300 — Гомельскага абласнога ўпраўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Тацціяны Міхайлоўскай.

— Гісторыя сведчыць, — гаворыць Тацціяна Леанідаўна, — што пасля адмены ў Расіі прыгоннага права дзелавая актыўнасць у Гомелі прыкметна павялічылася. Праз горад пачалося будаўніцтва Лібава-Роменскай чыгункі, якая злучыла Украіну з Прыбалтыкай, а таксама Палескай чыгункі: яна злучае ўсю паўднёвую частку сучаснай Беларусі, Польшчу, Украіну. Усё гэта прывяло да вельмі хуткага прытоку насельніцтва. Для вырашэння надзённых пытанняў гарадскога жыцця неабходна была паўнавартасная фінансавая ўстанова. Магчыма, гэтым і абумоўлена з'яўленне адпаведнага рашэння Сената аб заснаванні ў Гомелі гарадскога грамадскага банка.

— Відавочна, што гэты дакумент стаў асновай для закладкі фундамента фінансавай установы, традыцыі якой сёння ўвасабляе абласное ўпраўленне Беларусбанка?

— Лічыце, што так. У ліпені 1923 года была ўтворана Гомельская працоўная ашчадная каса № 31. Ішоў час. Мянялася назва ўстановы, яе функцыі, месца размяшчэння, але адно заставалася нязменным — гэта людзі, адданыя ашчаднай справе, якія любяць сваю працу і паважаюць кліентаў. Менавіта яны заклалі трывалы фундамент, на якім сёння працуе наш банк.

— Які за дзевяць дзесяткаў гадоў ператварыўся ў рэгіянальнага лідара?

— Гэта бясспрэчны факт. Сёння Гомельскае абласное ўпраўленне ААТ «ААБ Беларусбанк» мае самую разгалінаваную сетку сярод банкаўскіх устаноў рэгіёна: 5 філіялаў, 18 цэнтраў банкаўскіх паслуг, 217 аддзяленняў (у тым ліку 121 аддзяленне размешчана ў сельскіх населеных пунктах) і 23 абменныя пункты валют. Адметнасць нашага банка ад многіх іншых у тым, што толькі мы прысутнічаем у сельскай мясцовасці і аказваем шырокі спектр банкаўскіх паслуг жыхарам аграгарадкоў і невялікіх вёсак і пасёлкаў. Самі разумееце, што аб вялікай прыбытковасці ў працы ў такіх населеных пунктах размова не ідзе, але ж на тое мы і банк для народа. Наш слоган: Беларусбанк — заўсёды побач.

Пераадольваць цяжкасці заўсёды лягчэй разам, калі працуе згуртаваная каманда, аб'яднаная агульнай мэтай і агульнымі інтарэсамі. Менавіта такая каманда аднадумцаў працуе ва ўстановах ААТ «ААБ Беларусбанк», у тым ліку і ў Гомельскім упраўленні.

— Тацціяна Леанідаўна, у любой галіне эканомікі, а ў банкаўскай сферы асабліва, характэрная рыса ў развіцці — гэта канкурэнцыя. Кожны хоча заняць найбольш выгаднае месца пад сонцам...

— Зразумела, да чаго хіліце. У Гомельскай вобласці працуюць 22 банкаўскія ўстановы. Не я гэта прыдумала, што канкурэнцыя — гэта рухавік прагрэсу. І мы да яе гатовы. Нягледзячы на канкурэнцыю, якая ўсё больш узмацняецца ў банкаўскай сферы, ААТ «ААБ Беларусбанк» працягвае ўтрымліваць лідзіруючае становішча на рынку банкаўскіх паслуг Гомельскай вобласці.

Асноўны прыярытэт у працы банка — гэта кліенты. Індывідуальны падыход, давер і адкрытасць у партнёрскіх адносінах з тымі, хто аддае перавагу Беларусбанку, — асноўныя прынцыпы нашай працы. Рэпутацыя, надзейнасць і лаяльнасць да кліентаў — гэта тыя вечныя каштоўнасці, якія сёння выходзяць на першы план. Галоўнай сваёй мэтай банк лічыць прадастаўленне кожнаму кліенту шырокага комплексу якасных, канкурэнтаздольных і высокатэхналагічных банкаўскіх прадуктаў і паслуг, аказанне яму дапамогі ў выбары таго набору паслуг і формаў разліку, якія б у найбольшай ступені адпавядалі патрэбам кліента.

Мы пастаянна працуем над пашырэннем спектра аказваемых банкаўскіх паслуг (іх сёння больш за 140) і над павышэннем іх якасці за кошт высокага прафесіяналізму супрацоўнікаў. Дарэчы, садзейнічанне развіццю бізнэсу кліента праз продаж яму поўнага комплексу наяўных банкаўскіх прадуктаў і паслуг і ўкараненне новых, спецыяльна распрацаваных — гэта першачарговая задача банка. А шырокая філіяльная сетка Беларусбанка ў вобласці дае кліенту магчымасць выбару найбольш зручнага месца абслугоўвання, зыходзячы са свайго тэрытарыяльнага месцазнаходжання.

— Пэўна, што эфектыўнасць работы Гомельскага абласнога ўпраўлення Беларусбанка вызначаецца і ў залежнасці ад дасягнутага каэфіцыента карыснага дзеяння вашых калег па рэгіянальных філіялах?

— Безумоўна. Тут, як гаворыцца, у кожнага свае сакрэты і напрацоўкі, каб дасягнуць поспеху ў рабоце. Не ў якасці выхвалення скажу, што Гомельскае абласное ўпраўленне ў сістэме ААТ «ААБ Беларусбанк» займае годную пазіцыю. Сярод шасці абласных упраўленняў банка наша вобласць па памеры атрыманага прыбытку на аднаго работніка выйшла на 2-е месца па выніках першага паўгоддзя. Як вынік — забяспечаны рост прадукцыйнасці працы.

— Тацціяна Леанідаўна, сёлетні 2012 год — знакавы год для «ААБ Беларусбанка» і для Гомельскага ўпраўлення ў прыватнасці: — неўзабаве святкаванне 90-гадовага юбілею. З якім настроем рыхтуецеся яго сустракаць?

— Юбілейную дату Гомельскае абласное ўпраўленне ААТ «ААБ Беларусбанк» сустракае зладжанай працай і нядрэннымі паказчыкамі, упэўнена ўтрымліваючы лідзіруючыя пазіцыі сярод банкаў вобласці і адыгрываючы значную ролю ў яе эканамічным развіцці.

Захаваць і ўмацаваць пазіцыі банка ў рэгіёне — такую задачу мы ставім перад сабой. І ўпэўнены, што нам яна па сіле.

РОЗНІЧНЫ БІЗНЭС

Якасць і развіццё паслуг

Развіццю і якасці рознічных банкаўскіх паслуг Беларусбанк надае самую пільную ўвагу: прапануе новыя паслугі і віды збераженняў для розных сацыяльных груп насельніцтва, укараняе прагрэсіўныя тэхналогіі, у аддзяленнях банка ствараюцца максімальна камфортныя для кліентаў умовы.

Бездакорная рэпутацыя, сфарміраваная банкам за дзесяцігоддзі, дазваляе нават ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі прыцягваць новых кліентаў.

На 1 жніўня 2012 года аб'ём сродкаў насельніцтва на ўкладных рахунках у структурных падраздзяленнях Беларусбанка Гомельскай вобласці дасягнуў 3,1 трлн беларускіх рублёў у эквіваленце ўсіх валют. Сярэдні астатак сродкаў, якія прыпадаюць на аднаго жыхара Гомельскай вобласці, вырас да 2,2 млн рублёў у эквіваленце.

Асаблівая ўвага надаецца людзям пенсійнага ўзросту. Банк стараецца забяспечыць высокую якасць іх абслугоўвання, акружаючы ўвагай і клопатам.

Сёння банк прапануе сваім кліентам поўны спектр валютна-абменных аперацый, уключаючы замену, размен, інкаса наяўнай замежнай валюты, аперацыі з дарожнымі чэкамі.

ААТ «ААБ Беларусбанк» ажыццяўляе актыўную рэалізацыю насельніцтву атэставаных брыльянтаў і каштоўных металаў, па аб'ёмах продажу якіх займае лідзіруючыя пазіцыі.

Запатрабаваны паслугі па адпраўцы і атрыманні міжнародных пераводаў. ААТ «ААБ Беларусбанк» ажыццяўляе тэрміновыя пераводы па сістэмах Western Union у 108 пунктах абслугоўвання і BLIZKO ў 84 аддзяленнях вобласці, а таксама міжнародныя банкаўскія пераводы па сістэме SWIFT.

Асобная ўвага — якасці кансультацый. Добразычліва сустракаючы кожнага наведвальніка, спецыяліст банка заўсёды гатовы аказаць прафесійную дапамогу ў вырашэнні самых складаных пытанняў.

Беларусбанк і ў 90 гадоў застаецца сучасным, паспяховым і надзейным.

КАРПАРАТЫЎНЫ БІЗНЭС

У прыярытэтах — партнёрскія ўзаемаадносіны

— Палітыка філіяла банка ў працы з кліентамі будуецца на прынцыпах усталявання партнёрскіх адносін з разлікам на доўгатэрміновае супрацоўніцтва, — гаворыць намеснік начальніка філіяла абласнога ўпраўлення, начальнік цэнтра карпаратыўнага бізнэсу Андрэй ГРАМЫКА, — і накіравана на забеспячэнне комплекснага і якаснага абслугоўвання.

Прыярытэтнымі відамі паслуг, якія запатрабаваны кліентамі, акрамя разлікова-касавага абслугоўвання (у асноўным па сістэме «Кліент—Банк»), застаюцца: кароткатэрміновае і доўгатэрміновае крэдытаванне (у тым ліку за кошт замежных крэдытных ліній); абслугоўванне знешнегандлёвых аперацый кліентаў (у тым ліку з выкарыстаннем інструментаў гандлёвага фінансавання); заработныя праекты; карпаратыўныя пластыкавыя карткі, інкасацыя наяўных грошай і перавозка каштоўнасцяў; прыём грашовай выручкі ад прадстаўнікоў юрыдычных асоб і інш.

З'яўляючыся найбуйнейшым дэпазітарным цэнтрам рэспублікі, які дзейнічае з 1996 года, банк прапануе поўны комплекс паслуг па дэпазітарным абслугоўванні суб'ектаў гаспадарання, арганізацыі выпуску карпаратыўных аблігацый, даверным кіраванні і аперацыях з каштоўнымі паперамі і інш.

Арганізацыя крэдытнай падтрымкі прадпрыемствам, у тым ліку ў рамках рэалізацыі дзяржаўных інвестыцыйных праграм, накіраваных на новае будаўніцтва, мадэрнізацыю і тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці і ўдасканальванне тэхналагічных працэсаў, крэдытавання валютаакупных праектаў, накіраваных на вытворчасць імпартазамяшчальнай прадукцыі, па-ранейшаму застаецца адным з асноўных кірункаў дзейнасці банка. Так, у рамках развіцця дрэваапрацоўчай прамысловасці, стварэння, тэхнічнага перааснашчэння і рэканструкцыі вытворчасцяў прадукцыі дрэваапрацоўкі банк удзельнічае ў рэалізацыі маштабных інвестыцыйных праектаў прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай галіны Гомельскай вобласці.

У адпаведнасці з Праграмай развіцця шкляной прамысловасці Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы Беларусбанка рэалізуецца найбуйнейшы інвестыцыйны праект па будаўніцтве новай тэхналагічнай лініі для вытворчасці ліставога паліраванага шкла магутнасцю 780 тон шкламасы ў суткі з цэхам прыгатавання шыхты. Працягваецца праца па фінансаванні банкам праектаў па мадэрнізацыі прадпрыемстваў малочнай галіны.

У ліку найважнейшых перспектыўных кірункаў супрацоўніцтва банка з найбуйнейшымі аўтатранспартнымі прадпрыемствамі горада Гомеля і Гомельскай вобласці з'явілася падтрымка інвестыцыйнага праекта на абнаўленне аўтапарку вобласці і грузавога рухомага саставу, што садзейнічала павышэнню якасці аказання транспартных паслуг насельніцтву, развіццю міжнародных перавозак грузаў.

Адным з самых маштабных праектаў сёння з'яўляецца будаўніцтва Светлагорскага цэлюлозна-кардоннага камбіната. Беларусбанк удзельнічае ў гэтым праекце ў якасці банка агента, які суправаджае кітайскія крэдытныя лініі, а таксама ў якасці крэдытуючага банка. Гэта, безумоўна, вельмі важная і патрэбная для Беларусі вытворчасць.

Крэдытны партфель юрыдычных асоб устаноў Беларусбанка Гомельскай вобласці складае звыш 9 трыльёнаў беларускіх рублёў. Разам з прамым крэдытаваннем банк актыўна прыцягвае крэдытныя лініі і гандлёвае фінансаванне замежных банкаў.

Прыцягальнасць крэдытаў, што выдаюцца за кошт замежных крэдытных ліній, заключаецца ў больш нізкай працэнтнай стаўцы ў параўнанні з тымі, якія даюць беларускія банкі за кошт уласных рэсурсаў.

У цяперашні час за кошт прыцягнення замежных крэдытных ліній рэалізуюцца праекты на агульную суму звыш 150 млн еўра.

Сёння больш як 30% юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, зарэгістраваных у Гомельскай вобласці, знаходзіцца на абслугоўванні ў нашым банку.

ААТ «ААБ Беларусбанк» і ў 90 гадоў застаецца сучасным, паспяховым і надзейным.

Намеснік начальніка цэнтра карпаратыўнага бізнэсу, начальнік аддзела актыўных аперацый Алена КЛІМАВА, галоўны спецыяліст Дзмітрый ДРАГУН, вядучы спецыяліст Наталля КАВАЛЁВА, намеснік начальніка аддзела Наталля БЕРАЗНЯЦКАЯ.

Беларусбанк супрацоўнічае і з буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі, установамі, якія фінансуюцца з бюджэту, грамадскімі арганізацыямі, якія не аўтыцяўляюць гаспадарчую дзейнасць, прадпрымальнікамі і прадпрыемствамі, што прадстаўляюць малы і сярэдні бізнэс.

Індывідуальныя прадпрымальнікі займаюць значныя пазіцыі (47%) у кліенцкай базе ўстаноў банка Гомельскай вобласці. Нягледзячы на тое, што сёння гэтай катэгорыі кліентаў цікавыя, у асноўным, паслугі разлікова-касавага характару, маніторынг аперацый па рахунках паказвае на пазітыўную дынаміку як па колькасці спажытых імі прадуктаў і паслуг, так і па аб'ёмах.

Перш за ўсё, адзначым, што суб'екты малога прадпрымальніцтва сталі больш актыўна карыстацца такімі банкаўскімі паслугамі, як валютна-абменныя аперацыі, міжнародныя разлікі, інкасацыя грашовай наяўнасці, прыём выручкі і плацяжоў праз аддзяленні банка, крэдытаванне. Аднак не кожны прадпрымальнік ведае пра магчымасць атрымання крэдыту на развіццё бізнэсу. Індывідуальны падыход да гэтай катэгорыі кліентаў дазваляе банку «вырасціць» свайго кліента да ўзроўню «буйнога» і тым самым забяспечыць стабільны прырост і абнаўленне кліенцкай базы юрыдычных асоб.

У зале па разлікова-касавым абслугоўванні юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў аддзялення 300/138.

ПЛАСТЫКАВЫЯ КАРТКІ

Захаваем безнаяўныя грошы

Адным з сучасных і прагрэсіўных кірункаў рознічнага бізнэсу з'яўляецца прадастаўленне паслуг з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак. ААТ «ААБ Беларусбанк» асаблівую ўвагу надае працы з банкаўскімі пластыкавымі карткамі ў частцы развіцця інфраструктуры і паслуг пры выкарыстанні пластыкавай карткі.

Сёння практычна ў кожнага жыхара вобласці ёсць картка ААТ «Беларусбанка», бо 47% усяго аб'ёму выпушчаных пластыкавых карт у вобласці — нашы. З чэрвеня 2012 г. ААТ «ААБ Беларусбанк» распачаў выпуск новага картачнага прадукту «Падарункавая картка», якую можна набыць усяго за некалькі хвілін ва ўстановах банка. Пластыкавая картка ўпакавана ў прыгожы канверт і стане жаданым падарункам родным і блізкім.

Нашы клиенты карыстаюцца шырокай сеткай банкаматаў і інфакіёскаў, якая пастаянна пашыраецца. Парк абсталявання банка для абслугоўвання трымальнікаў пластыкавых картак у цяперашні час прадстаўлены мноствам банкаматаў, інфакіёскаў, пунктаў выдачы наяўных і прыёму камунальных плацяжоў, тэрміналаў на прадпрыемствах гандлю і сэрвісу.

З мэтай паляпшэння якасці абслугоўвання Беларусбанкам заключаны пагадненні з ААТ «БПС-Сбербанк», ААТ «Белаграпрамбанк», ААТ «Белінвестбанк», у адпаведнасці з якімі трымальнікі банкаўскіх картак, эмітаваных ААТ «ААБ Беларусбанк», могуць абслугоўвацца ў банкаматах названых банкаў на роўных умовах, г.зн. ажыццяўляць зняцце наяўных грашовых сродкаў без спагнання камісійнай узнагароды.

Вялікай папулярнасцю ў кліентаў карыстаюцца інфакіёскі банка, якія дазваляюць ажыццяўляць безнаяўныя плацяжы з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак. Так, сёння ў інфакіёсках банка можна аплаціць усе камунальныя плацяжы з дапамогай сістэмы «Разлік» Нацыянальнага банка, плацяжы па крэдытах, выдадзеных ААТ «ААБ Беларусбанк», ажыццявіць папаўненне ўкладаў фінансавай установы як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце, ажыццявіць імгненны перавод на картку эмітаваную ААТ «ААБ Беларусбанк», здзейсніць любы плацеж па прызначэнні (па рэквізітах атрымальніка плацяжу) і нават набыць білеты на аўтобусы.

Улічваючы вялікую канкурэнцыю ў кірунку гандлёвай дзейнасці, для павелічэння аб'ёмаў безнаяўных плацяжоў і паляпшэння якасці абслугоўвання кліентаў банк гатовы прапанаваць як эфектыўны сродак павелічэння аб'ёмаў продажаў, праграмы лаяльнасці для трымальнікаў пластыкавых картак.

З мэтай папулярызацыі плацяжоў з выкарыстаннем пластыкавых картак і павелічэння ўдзельнай вагі безнаяўных разлікаў у рознічным тавараабароце філіял № 300 — Гомельскае абласное ўпраўленне ААТ «ААБ Беларусбанк» і прадпрыемствы гандлю і сэрвісу праводзяць сумесныя рэкламныя кампаніі, акцыі і іншыя мерапрыемствы.

Вядучая фінансавая ўстанова краіны, улічваючы імклівы тэмпы развіцця грамадства, укараняе прагрэсіўныя тэхналогіі, пры гэтым вялікая ўвага надаецца дыстанцыйнаму абслугоўванню трымальнікаў пластыкавых картак. У вобласці актыўна развіваюцца і прасоўваюцца паслугі Інтэрнэт- і М-банкінг. У рамках мерапрыемстваў, прысвечаных 90-годдзю ААТ «ААБ Беларусбанк», у перыяд з 01.08.2012 па 31.12.2012 года арганізавана акцыя па выкарыстанні трымальнікамі пластыкавых картак банка паслугі М-банкінг без аплаты дадатку ў рамках тарыфнага плана «Базавы». Таксама да канца 2012 года не спаганяецца плата пры рэгістрацыі Інтэрнэт-банкінгу, як ва ўстановах банка, так і пры анлайн-рэгістрацыі.

Пачынаючы з 2006 года, банк актыўна правядзіць рэкламныя кампаніі і гульні для кліентаў, накіраваныя на папулярызацыю безнаяўных разлікаў з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак. Апошнія з іх стартавалі ў рэгіёнах з 1 мая 2012 года і накіраваны на стымуляванне арганізацый гандлю і сэрвісу прапанавання кліентам пераважна разлічвацца менавіта пластыкавай карткай. Пераможцы мінулых акцый ужо атрымалі магчымасць пабываць на Алімпіядзе ў Пекіне і Ванкуверы, адпачыць у французскім Дысней-ленде, адчуць незабыўную атмасферу футбола на чэмпіянаце свету FIFA 2010 у ПАР, пабываць у райскім мястэчку зямнога шара — на Кубе. У рэкламнай гульні «Зімні зіму на кубінскае лета», якая праводзілася Беларусбанкам, уладальнікам галоўнага прыза — паездкі на сонечную Кубу і грашовай сумы ў памеры 2,5 млн рублёў — стаў наш зямляк з г. Светлагорска Сяргей Лабур.

Дзейнасць філіялаў і ЦБП нацэлена на нарошчванне аб'ёмаў безнаяўных плацяжоў. Гэтаму садзейнічае інфармаванне працаўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый аб паслугах для трымальнікаў пластыкавых картак і перавагах безнаяўных плацяжоў.

Гандлёвы дом «Лагуна» заняў 1-е месца сярод прадпрыемстваў гандлю і сэрвісу Гомеля ў дасягненні найбольшага прыросту долі безнаяўных разлікаў па пластыкавых картках. Філіял № 300 — Гомельскае абласное ўпраўленне — адзначыла гэта дасягненне сваім падарункам: у гандлёвай зале «Лагуны» ўстанавіла сучасны тэрмінал для пластыкавых картак.

Аддзяленне 300/137 размешчана ў прыгожым старажытным будынку, дзе раней размяшчалася першая ашчадная каса Гомеля. Сярод працуючых тут сёння кантралёр Ала ДЗЯРПАЧ, спецыялісты па рознічных банкаўскіх паслуга Ларыса МЕЛЬНІКАВА і Святлана МІРАШНІЧЭНКА.

УМЕЕМ АДПАЧЫВАЦЬ

